беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая таксама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыднёва

НАША НІВА

№ 27 (65)
7 кастрычніка
1996 г.

выходзіць у панядзелкі

Лявон Баршчэўскі:

«Спачатку было рашэньне, а пасьля — ліст Пазьняка»



Пасьля таго, як Сойм БНФ прыняў рашэньне ня ўдзельнічаць у давыбарах дэпутатаў ВС і ў рэфэрэндуме, карэспандэнт «НН» Алег Дашкевіч зьвярнуўся па тлумачэньні да Лявона Баршчэўскага, які выконвае абавязкі старшыні БНФ.

Чытайце на старонцы 2.

Беларуская ідэя чакае лепшых часоў

II ЗЬЕЗД АГП

У мінулую суботу ў Менску працаваў II зьезд Аб'яднанай Грамадзянскай Партыі. Зьезд выявіў некалькі цікавых тэндэнцыяў у разьвіцьці ня толькі гэтай партыі, але і ўсяго палітычнага жыцьця Беларусі.

Выглядала на тое, што «грамадзяне» цалкам пазбаўленыя палітычнага рамантызму фронтаўскага гатунку. Пра гэта сьведчыць ужо склад кандыдатаў, вылучаных на давыбары ў ВС. Сярод іх значную частку складаюць людзі, якія ня так даўно насілі пагоны. Быў прадстаўлены ўвесь спэктар сілавых ведамстваў: дэсантнікі міністэрства абароны, сьледчыя пракуратуры, афіцэры дзяржбясьпекі, МУС і г.д. Амаль усе выйшлі ў запас у чыне палкоўніка. Гэта значыць, што яны — людзі дасьведчаныя ў працы згаданых службаў, з сувязямі і ўплывам у гэтых сфэрах. На чале гэтай катэгорыі партыйных вылучэнцаў — Юры Захаранка.

Па-другое, «грамадзяне» спрабуюць далучыць да сваёй фракцыі ў парлямэнце прадстаўнікоў прыватнага капіталу. Пэўна самая вядомая з гэтай групы кандыдатаў у дэпутаты — сп. Натальля Шаўко, кіраўнік фінансавай кампаніі ФІКО.

Зьбіраньне пад свае партыйныя сьцягі актыўных людзей зь юрыдычна-прававодой падрыхтоўкай і людзей з пэўным капіталам сьведчыць пра пэўны прафэсіяналізм на тле рамантызму іншых палітычных Дон Кіхотаў. Калі ўсё ж дойдзе да выбараў і «грамадзяне» здолеюць правесьці сваіх людзей у парлямэнт, то гэта будзе рэальная супрацьвага палкоўнікам Лукашэнкі і «завхозам» Ціцянкова.

Зь іншага боку, на зьезьдзе лібэралаў не было чуваць беларускага слова. Гэта сьведчыць пра тое, што нацыянальнымі праблемамі лібэралы не абцяжараныя. Прагматыкаў з АГП, здаецца, цалкам задавальняе свая краіна з назвай Беларусь, дзе б ніхто не перашкаджаў ім займацца сваім бізнэсам. Погляд спрэчны і, напэўна, недальнабачны. Бо якраз прагматычны падыход не пакідае месца для існаваньня фактычна яшчэ адной расейскай губэрні ў статусе незалежнай краіны.

Як бы там ні было, а сёньня ў змаганьні з антыбеларускім рэжымам А.Лукашэнкі прыкметную ролю граюць лібэралы з АГП — самая прафэсійная, але ня самая беларуская партыя.

Алег Дашкевіч



ЭЎТАНАЗІЯ

Легальная сьмерць

Эўтаназія — добраахвотная сьмерць невылечна хворага чалавека. Ужо некалькі гадоў у сьвеце спрачаюцца пра тое, ці могуць лекары такім чынам аблегчыць пакуты хворых — дапамагчы ім памерці. Спрэчкі працягваюцца, тымчасам на мінулым тыдні першы ў сьвеце чалавек абсалютна легальна скарыстаўся магчымасьцю эўтаназіі.

Гэта адбылося ў Паўночнай Тэрыторыі — адным з шасьці штатаў Аўстралійскага Зьвязу, — парлямэнт якога 1 ліпеня 1996 г. афіцыйна прыняў закон, які дазваляе эўтаназію.

66-гадовы Боб Дэнт, які на працягу пяці апошніх гадоў змагаўся зь невылечным ракам прастаты, дазволіў, каб кампутарны датчык увёў яму ў кроў атруту. Права на эўтаназію, якое дзейнічае ў Паўночнай Тэрыторыі, вымагае, каб просьба хворага, які прагне «лагоднай сьмерці», была зацьверджана трыма лекарамі, у тым ліку псыхіятрам і спэцыялістам у той хваробе, на якую церпіць пацыент.

(БРАТ)

Пра эўтаназію, а таксама пра нядаўняе вынаходніцтва гена старэньня, якое дазваляе жыць да 300 гадоў, чытайце ў нашай новай рубрыцы «ЧАЛАВЕК» на старонцы 10.

Літаратурны Нобэль — 1996



У чацьвер 3 кастрычніка ў 13 гадзінаў у Стакгольме было абвешчана імя Нобэлеўскага ляўрэата ў галіне літаратуры за 1996 г. Гэтым разам ляўрэатам стала польская паэтка з Кракава Віслава Шымборска, творчасьць якой адзначаецца праннікнёнасьцю ў псыхічны склад людзей і адначасова здольнасьцю вытрымліваць дыстанцыю паміж аўтаркаю й яе героямі. Сёлета Нобэлеўская прэмія складае 1 мільён 120 тысячаў даляраў.

Віслава Шымборска вельмі папулярная ў Польшчы, хоць яна, як прадстаўніца генэрацыі літаратараў, якім давялося адаптавацца да жыцьця за часамі камунізму, была ня вельмі любімаю сярод польскіх дысыдэнтаў. Паэзія Шымборскай досыць шырока перакладалася, у свой час літаратурнай падзеяй для чытацкай публікі ў СССР стала публікацыя падборкі яе вершаў на пачатку 70-х гадоў у «Иностранной литературе». Гэта ўжо чацьвертая літаратурная Нобэлеўская прэмія, якую атрымліваюць палякі: Генрык Сянкевіч, Уладыслаў Рэймант, Чэслаў Мілаш, Віслава Шымборска...

Сярод прэтэндэнтаў на сёлетняга Нобэля называліся літаратары з Латвіі, Эстоніі, Чувашыі, Францыі... Дыскусіі ў Нобэлеўскім камітэце прымушаюць думаць, што прэмію гэтым разам меркавалася даць літаратару зь Сярэдняе Эўропы, што ёсьць пэўная чарга па прэмію, што прэмію даюць таксама з улікам сацыяльна-палітычнага кантэксту. Беларускія інтарэсы ў Нобэлеўскім камітэце на належным узроўні яшчэ не зазначаліся.

Алег Дзярновіч

19 КАСТРЫЧНІКА

Напярэдадні падзеі

Беларускай палітыкі няма. Усё, што тут адбываецца, — супрацьстаяньне «вэртыкалі» і «гарызанталі», прэзыдэнта і ВС, — адбываецца строга ў рэчышчы «інтэграцыі з Расеяй», г.зн. тых ці іншых расейскіх інтарэсаў і больш ці менш цынічнае ліквідацыі незалежнай дзяржавы Беларусі.

Першы дэммітынг гэтай восені зьдзівіў ужо тым, што вёўся па-расейску. Слухаючы Бухвостава, думалася — ну, і што мне да таго, што ты так моцна ня любіш Лукашэнку? Гэта ты яго цяпер ня любіш. Але Лукашэнка ў свой час таксама выступаў на дэммітынгах, ня менш дэмакратычна, і таксама моцна не любіў Шушкевіча з Кебічам. Калі б Бухвостаў гаварыў па-беларуску, нас зь ім яднала б нешта большае, больш сапраўднае і стваральнае, чым нелюбоў да Лукашэнкі і дэмрыторыка.

Шарэцкі... «Дзядзька Сямён, мы з Вамі!» — напісалі студэнты на плакаціку. Ім дастаткова таго, што «дзядзька Сямён» — «супраць Лукі». Ім пакуль яшчэ не істотна, за што гэты «дзядзька». Ім пакуль ня хочацца думаць пра тое, што ён — «за саюз», што ён лабызаецца з Старадубцавым і ладзіць дружбу з арлоўскім стагнатарам Строевым.

Як усё ж гэты «Лука» здолеў аб'яднаць супраць сябе боб з гарохам!

Г.Карпенка на прэс-канфэрэнцыі ў Маскве кажа, што Лукашэнка толькі шмат гаворыць пра аб'яднаньне з Расеяй, але нічога для гэтага ня робіць. Маўляў, а мы, дэмакраты, гатовыя рэальнымі справамі... Падтрымай нас, Масква, «рашы наш вапрос».

На зьезьдзе гайдараўскай партыі — Дэмвыбару Расеі — у залі чалавек пяцьдзесят. Выступае лідар. Тэлекамэра выхоплівае твары двух самых засяроджаных слухачоў — Багданкевіча і Дабравольскага. Памажы, Масква...

Ты ж дапамагаеш у Чачэніі, дык чаму ж табе не дапамагчы ў Беларусі?

Камуністы таксама сталі дэмакратамі. Новікаў і Калякін з намі! — радуюцца палітызаваныя студэнты. — Яны таксама супраць «Лукі». Таксама хочуць яго скінуць. А для чаго? Каб хутчэй аднавіць «саюз» — у іх так у праграме на самым відным месцы напісана...

Ёсьць, вядома, ва ўсім гэтым вялікая аб'ектыўнасьць. Бо нішто ніадкуль не бярэцца і не зьнікае бясьсьледна. Але на тое ў гісторыі і зьяўляюцца суб'екты палітыкі, каб зьмяняць зададзеную хаду падзей — да лепшага ці да горшага. Калі такіх суб'ектаў няма, тады праточныя азёры ператвараюцца ў гнілыя балоты і пакрываюцца сьмярдзючаю раскай — на доўгія-доўгія гады.

Беларускай палітыкі няма, бо сярод удзельнікаў тутэйшай палітыкі няма суб'екта, які б выражаў не маскоўскія, а беларускія інтарэсы. Вы скажаце: а БНФ?

19 кастрычніка адбудуцца два ўсебеларускія кангрэсы — Лукашэнкаў і дэмакратаў. Подпісу БНФ пад заяваю дэмкангрэсу няма. Можа стацца, што ўся праца абодвух сходаў зьвядзецца да сваркі ў бок супраціўніка і да даказваньня — хто больш інтэгратар з Расеяй. Даказваць, хто больш любіць Беларусь, напэўна, ня будуць ні вэртыкальшчыкі, ні дэмакраты.

БНФ у гэты дзень плянуе сабраць стотысячны мітынг. Стаўка Фронту занадта вялікая: быць ці ня быць. Бо пасьля 19-га, калі вулічнай рэвалюцыі не адбудзецца, сытуацыя Фронту можа радыкальна зьмяніцца ў горшы бок. А калі рэвалюцыя адбудзецца? І «стотысячная грамада» скіне «Луку» і ўзьнясе на ўладу... прэзыдыюм дэмкангрэса? Прэзыдыюм скасуе пасаду прэзыдэнта і аб'явіць пра аднаўленьне БССР. На лукашэнкаўскі сьцяг вернуць серп і молат...

А можа, на «стотысячны» мітынг прыедзе Пазьняк і скажа: «Хопіць парушаць законы, до мітусіцца — хто выгадней прадасьць Бацькаўшчыну»? І тады мітынг узьнясе яго? А мы створым яму дэмакратычную апазыцыю. Сапраўдную.

Ведаючы, прынамсі, што ніхто не адбярэ ў нас краіну...

Сяргей Паўлоўскі

ВІЛЬНЯ

Вяртаньне Гедыміна



22 верасьня ў Вільні на Катэдральнай плошчы быў урачыста адкрыты манумэнт Вялікаму князю Гедыміну. Помнік адкрыў прэзыдэнт краіны А.Бразаўскас. Не прысутнічаў толькі аўтар — 81-гадовы Вітаўт Кашуба, які жыве ў Нью Ёрку і якому прыехаць не дазволіла здароўе.

Падрабязна пра гэта — на старонцы 13.

ГІСТОРЫЯ

Партыя «Зялёнага Дуба»

Гісторыя беларускага антыбальшавіцкага руху пішацца цяжка. Доўгія гады матэрыялы былі схаваная ў архівах КГБ, спэцсховішчах, за грыфам «сакрэтна». Што тычыцца гісторыі антысавецкай палітычнай арганізацыі баявога тыпу «Зялёны Дуб» (яе афіцыйная назва: Беларуская сялянская партыя «Зялёнага Дуба»), то дагэтуль у ёй шмат нявысьветленага. У савецкай гістарыяграфіі за гэтай арганізацыяй замацаваўся безапэляцыйны штамп «тыпова бандыцкай».

Артыкул «Атаман Дзяргач» — на старонцы 13.

Дзьмітро Карчынскі:

«Крайнія хаты заўжды гараць першымі»...

Гутарка зь Дзьмітром Карчынскім, адным зь лідэраў УНА-УНСО — пра новую ўкраінскую канстытуцыю, пра забарону УНА-УНСО і пашыранае меркаваньне аб сувязі гэтай арганізацыі з фашызмам, пра сусьветную рэвалюцыю і падзеі ў Беларусі. На старонцы 4.

Іншыя матэрыялы пра УНА-УНСО — на старонцы 2.

Маладыя фаталізм

Сярод беларускага грамадзтва распаўсюджаныя ўяўленьні пра выключнасьць сёньняшніх падзеяў і незваротнасьць таго, што адбудзецца заўтра. Людзі альбо стомленыя, альбо рыхтуюцца да самых дзёрзкіх у сваім жыцьці (паводле іх уяўленьняў) учынкаў. Вось герачнае адчуваньне часу, за якім стаіць вера ў непаўторнасьць нашага часу. А гэта значыць, што час наш перадвызначаны й яму трэба ці аддацца, што вымагае гераізму, ці скарыцца зь ім. У любым выпадку мы маем справу зь беларускім фаталізмам.

Як сьветапоглядная канцэпцыя фаталізм вымагае прызнаць, што ўсе працэсы, якія адбываюцца ў сьвеце, падпарадкаваныя неабходнасьці, значыць — не застаецца месца свабодзе й творчасьці. Беларусы абралі амаль шэлінгаўскі варыянт, калі разрыў свабоды й неабходнасьці пазбаўляе чалавека магчымасьці свабодна дзейнічаць. Гэты беларускі варыянт фаталізму стварае выдатную магчымасьць для параўнаньня з рэлігійным фаталізмам, які выходзіць з перадвызначанасьці падзеяў гісторыі й жыцьця чалавека воляю Бога. Але ў рамках тэалягічнага фаталізму ідзе дыскусія паміж канцэпцыямі абсалютнай перадвызначанасьці і ўяўленьнямі, якія сумяшчаюць усемагутнасьць найвышэйшай сілы са свабоднай воляю чалавека. Традыцыяналісцкія канфэсіі ў хрысьціянстве — каталіцтва ды праваслаўе — абгрунтоўваюць апошні згаданы варыянт сьветаўяўленьня, пакідаючы чалавеку прастору для самастойнае дзейнасьці. За хрысьціянскімі канфэсіямі стаіць двухтысячагадовая традыцыя з напружанай інтэлектуальнай гісторыяй. За беларускім фаталізмам стаіць пяць гадоў уласнае гісторыі.

Тут мы мусім крыху адхіліцца й закрануць праблему «пяці гадоў». Палітыкі ва ўсім сьвеце, а таксама бальшыня саміх беларусаў усьведамляюць суб'ектную гісторыю Беларусі менавіта праз катэгорыю «пяці гадоў» — гэта значыць, што ўсю беларускую гісторыю яны прапускаюць праз пяць гадоў незалежнасьці, што нашу гісторыю разглядаюць сроз призму гэтых гадоў, і адказы на пытаньні мінулага шукаюць у сёньняшнім часе: слабыя, бо,.. спазьніліся тады, бо... Але ў беларускай культуры застаецца вельмі важны аргумэнт — гэтая зямля заўжды мела сваю аўтаномную гісторыю, якая з гледзішча цэнтраў дзяржаўных канглямэратаў (Кіева, Кракава й Варшавы, Масквы-Пецярбурга-Масквы) выглядала сэпаратысцкаю. Беларуская культура можа актуалізоўваць розныя эпізоды ранейшае гісторыі тэрыторыі, а гэта ўжо стварае гістарыяграфію. Такім чынам, беларуская культура мае сваю гісторыю й ніяк яна не задаволіцца «пяцьцю гадамі».

Вось тут і схаваны дысбалянс — абмежаваныя магчымасьці беларускае культуры на сваёй тэрыторыі пакідаюць беларусам толькі «пяць гадоў» беларускае гісторыі. Маладыя сэкулярызаваны народ, маючы зусім малы досьвед уласнае гісторыі, сутыкнуўшыся з такім дэманічным наступам, лёгка выбірае фаталізм.

Пэўныя ўяўленьні пра сусьветную гісторыю, крыху ведаў з тэалёгіі дазваляюць перададолець беларускі фаталізм, бо гэтыя веды пазбаўляюць адчуваньня выключнасьці сытуацыі. Дэфаталізацыя перадвызначыць нашую актыўнасьць з рэакцыі адчаю ў прадуманную сыстэму дзеяньняў.

Алег Дзярновіч

Студэнтаў «за палітыку» выганяюць з ВНУ

Прэзыдэнту і ўраду непатрэбныя лішнія «галасы» перад пачаткам рэфэрэндуму і «народнага хуралу». Усьлед за незалежнымі СМІ да палітычнымі партыямі прыйшла чарга актыўных асобаў, удзельнікаў апазыцыйнага руху, студэнтаў. Першая ластаўка —Павал Карназыцкі, пра якога ўвесну ўжо пісала «НН».

Павал Карназыцкі ў 18 гадоў стварыў на сваёй радзіме ў Паставах суполку БНФ, ён сябра Сойму БНФ, актывіст Свабоднага Прафсаюзу Студэнтаў і незалежны журналіст. За ўдзел у акцыі 30 траўня адседзеў 6 сутак у спэцразмеркавальніку на вул. Прылуцкай. Тады ад адлічэньня з факультэту журналістыкі яго ўратавала радыё «Свабода» і іншыя незалежныя сродкі масавай інфармацыі. Яму дазволілі перанесьці сэсію на восень. Але восеньню яму не дазволілі здаць запазычанасьці, створаныя «Прылукамі». Іншым яго сукурсьнікам здача запазычанасьцяў дазволена. Загад пра Паўла ляжыць на стале ў рэктара.

Непрыемнасьці ў П.Карназыцкага пачаліся пасьля таго, калі ён адмовіў супрацоўнікам КГБ, якія прыходзілі на факультэт і прапанавалі яму стаць «інфарматарам». Пасьля адлічэньня да яго зноў прыходзілі з прапановаю: узновіць на факультэце і ўладкуюць на працу ў прэзыдэнцкую газэту — толькі супрацоўнічай. Павал Карназыцкі адмовіўся. Цяпер ён без вучобы.

Ходзяць чуткі пра адлічэньне і іншых студэнтаў, якія сядзелі за веснавыя акцыі. Як бачым, Лукашэнка не забывае сваіх «герояў». Павал Карназыцкі — першая ластаўка. Хто наступны?

S.P.

Лявон Баршчэўскі:

«Спачатку было рашэньне, а пасьля — ліст Пазьняка»

Працяг са старонкі 1.

«НН»: Сп. Баршчэўскі, як Вы лічыце, што будзе 19 кастрычніка? Кажуць, што ўнутраным войскам выдадзены боекамплект, што спэцназу будзе 10 тысяч чалавек...

Л.Б.: Да ўсіх гэтых паведамленьняў мы ставімся, як да шараговых. Такія загады аддаюцца амаль кожны раз. Тут нічога новага няма.

«НН»: Але падобна на тое, што сёньня іншая сытуацыя, чым у іншыя разы. І таму ў гэтых чутках значна больш пагрозы.

Л.Б.: Наколькі мне вядома, якасна іншай сытуацыі няма. І раней Лукашэнка баяўся, і нават хаваўся ў сябе ў рэзыдэнцыі. Я думаю, што прынцыпова нічога, на жаль, не зьмянілася. Пытаньне імпічмэнту ўвязла з-за нерашучасьці, якая можа быць вытлумачана ўнутраным расколам камуністаў і аграрыяў. Калі ж імпічмэнт ня будзе праведзены своечасова, то, я думаю, што Лукашэнку ўжо ня трэба будзе баяцца.

«НН»: Чаму Фронт ухіліўся ад давыбараў і якую ролю ў гэтым рашэньні адыграў ліст З.Пазьняка з Амэрыкі?

Л.Б.: Ліст прыйшоў значна пазьней, чым мы прынялі рашэньне. Гэта па-першае. Падругое, мы не ўхіляемся ад давыбараў. Мы ня будзем удзельнічаць у давыбарах толькі ў тым выпадку, калі яны супадуць з рэфэрэндумам. Калі ж яны будуць у розныя дні, мы, безумоўна, будзем удзельнічаць у выбарах.

Тыя спэцыялісты, якія нам пралічвалі магчымыя сытуацыі, кажуць, што рэальна нанесьці паразу рэжыму можна толькі ў выпадку мінімальнага прыходу людзей на рэфэрэндум. Калі лічба будзе ня больш за шэсьцьдзесят працэнтаў. А калі будзе каля сямідзесяці, то Лукашэнка адназначна выйграе гэты рэфэрэндум. Таму мы і прынялі такое рашэньне. Гэта сапраўды ня воля кагосьці аднаго. Рашэньне прымалася вельмі цяжка, пасьля вельмі глыбокага, грунтоўнага аналізу.

«НН»: Вы лічыце, што Ваша пазыцыя больш абгрунтаваная, чым пазыцыя тых партый, якія ўсё ж вырашылі ўдзельнічаць?

Л.Б.: Я думаю, што астатнія партыі далучацца да нас. Бо рэфэрэндум будзе сёмага. Гэта цяпер ужо ні ў кога не выклікае сумневаў. Яны далучацца да байкоту. Калі ж рэфэрэндум будзе сёмага, а выбары 24-га, мы будзем у іх удзельнічаць. Для гэтага кандыдатаў мы вылучым зараз. Бо сёмага будзе позна. Але да сёмага забаронім кандыдатам весьці любую працу, апрача як па рэфэрэндуму. За сябе ніякай агітацыі. Будзе такое жорсткае партыйнае рашэньне.

Што да кандыдатаў зь ліку нашых прыхільнікаў, то мы ня можам ім забараніць нешта рабіць. Але мы будзем тлумачыць, што гэта шкодна. Таму што любая агітацыя за любога кандыдата — гэта прывод ня толькі сваіх прыхільнікаў, але й праціўнікаў.

«НН»: Ці мае Фронт лідараў, якіх можна было б вылучаць на самыя высокія пасады ў дзяржаве?

Л.Б.: Я не хачу сказаць, што Фронт — адзіны, хто мог бы сфармаваць урад цалкам. Мы можам на сёньняшні дзень сфармаваць урад з кваліфікаваных людзей, дарэчы, ня толькі зь сяброў Фронту, па ўсіх пазыцыях. Вядома, такой мэты мы ня ставім, бо ўрад пераходнага пэрыяду будзе кааліцыйны, і мы будзем дамагацца ў ім такіх пасадаў, як кіраўніцтва адукацыяй і культурай.

«НН»: А што тычыцца пасады прэзыдэнта?

Л.Б.: Мы будзем змагацца і далей, і, магчыма, разам з камуністамі, за тое, каб вярнуцца да парлямэнцкай рэспублікі на нямецкі ўзор. Са слабым прэзыдэнтам.

Калі слабы прэзыдэнт, то яго будзе выбіраць большасьць парлямэнту. Якая будзе большасьць, такога і выберуць. Што тычыцца Фронту, то ў нас ёсьць моцныя кандыдаты. Напрыклад, Іван Нікітчанка мог бы быць і сьпікерам, і прэм'ерам. Чалавек абсалютна здольны паводле свайго досьведу і арганізацыйных магчымасьцяў... Я не выкрэсьліваю ні Пазьняка, ні Голубева, нікога іншага.

«НН»: Раней, калі Фронт цярпеў паразы, гучалі словы пра маральную перамогу і пра цывілізаваную краіну. Ці лічыце вы так і цяпер?

Л.Б.: Я лічу, што мы жывем у нецывілізаванай краіне.

Палітвязьняў-украінцаў аддадуць ва Ўкраіну

Прадстаўнік Міністэрства юстыцыі абверг інфармацыю газэты «Кіеўскія ведамасьці» аб тым, што ўкраінскія ўлады зьвярнуліся да Беларусі з просьбай аб перадачы сямі ўкраінцаў для адбыцьця пакараньня ва Ўкраіну, але заўважыў, што паводле Венскай канвэнцыі, іх перададуць на бацькаўшчыну без аніякіх дадатковых просьбаў. Палажэньне канвэнцыі ён падмацаваў тым аргумэнтам, што беларускія падаткаплацельшчыкі не павінны ўтрымліваць за свой кошт украінцаў. Цяпер распрацоўваецца мэханізм перадачы зьняволеных украінскаму боку.



Беларускія падаткаплацельшчыкі сапраўды з большым задавальненнем наўпрост перадаюць перадачы ў турму для асуджаных, чым плацяць падаткі на ўтрыманьне нашай справядлівай юстыцыі, і таму яны будуць зусім ня супраць таго, каб неўзабаве сем ахвяраў рэжыму атрымалі, як сьпяваецца ў папулярным хіце «Братоў Гадзюкіных» з альбому «Мы — хлопцы з Бандэрштату», «сорак пачкаў «Верхавіны», шапку, чобаты, куфайку», — што належыць кожнаму вольнаму ўкраінцу.

Застаецца адзін Адамовіч?

Ціхан Баран

Краіна кансьпіратыўных

Ідэальны спосаб падвесьці вынікі... Ідэальны спосаб распрацаваць далейшую дзейнасьць... Ты сядзіш на кватэры, п'еш пахкую густую гарбату, абмяркоўваеш свае пытаньні. Зусім звычайная сытуацыя, за выключэньнем аднаго — кватэра, на якой ты сядзіш — кансьпіратыўная.

Гісторыя кансьпіратыўных кватэр цягнецца з часоў Расейскай імпэрыі. У іх быў свой заняпад у часы Сталіна і сваё адраджэньне — у «хрушчоўску адлігу». На начных кухнях нашыя «шасьцідзясятнікі» абмяркоўвалі стан свайго грамадзтва, слухалі «варожыя галасы», чыталі «Новый Мир». Да дзірак заціралі часопісы з аповесьцямі Салжаніцына, забароненых у тыя часы Пастэрнака і Бродзкага. Менавіта на гэтых кухнях палезьлі нібы зь нябыту парасткі дэмакратыі...

Ужо потым я ніколі не разумеў усялякіх партыяў, якія праводзілі свае зьезды ў вялікіх залях, працуючы паводле рэгляманту з 9 да 18, зь перапынкам на абед і галасуючы мандатамі. Адсутнасьць гарачай пахкай гарбаты, шчырай размовы адзін на адзін...

Нават канапа, на якой можна проста раскінуць рукі — гэта ўжо дадатковая ступень свабоды. З асабістай свабоды пачынаецца свабода грамадзтва. Андрэй Сахараў і падобныя не зьбіралі ніколі партыйных зьездаў. Яны — выхаванцы начных кухань і шчырых размоў.

Зараз усім вядомыя і дазволеныя Сахараў і Салжаніцын, Бродзкі і Растраповіч. Але ўсё пачынаецца зноўку. Дарэчы, яно і не скончалася ніколі. Нават у «звышдэмакратычныя» часы існавалі людзі, якія мелі больш радыкальныя погляды і ішлі далей за грамадзкасьць. Яны захавалі гэтую

"Наша Ніва" незалежны тыднёвік НАША НІВА
заснаваны ў 1906, адноўлены ў 1991
заснавальнік і выдавец Павал Жук
рэдактар Сяргей Дубавец
адказны сакратар Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
навіны Уладзімер Бараніч
рэдактар дадатку "Інфарматар" Андрэй Лапцёнак
макет Віктар Корзун
дызайн і вёрстка Лявон Раманчык
набор Тацяна Чуйвід
стыль і карэктура Паўлюк Канавальчык пры ўдзеле Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі Зьміцер Бартосік (тэл. 56-94-36)
АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ 220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 239-78-49
E-mail: edit@niva.minsk.by
Падпісны індэкс 63125
Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Як гартавалася сталь

Канфэрэнцыя ультралевых у Барсэлёне

Гэты тэкст трапіў да мяне выпадкова. Калі я яго прачытаў, я вырашыў, што трэба гэта перакласьці. А калі палову ночы прасядзеў над перакладам, вырашыў, што ён варты друку. «Друкуй, — сказаў мне мой сябра. — Толькі падпісвайся ня імем тых, хто гэта пісаў. Бо ўсё гэта было на самой справе». Але «Наша Ніва» не друкуе псэўданімаў. Таму аўтарства прыходзіцца браць на сябе — у выглядзе аўтара перакладу.

Усе падзеі, выкладзеныя ніжэй, сапраўды мелі месца ў Каталёніі ў жніўні 1996 г. Прозьвішчы і імёны зьменены ў мэтах рэвалюцыйнай канспірацыі.

Калі мяне, анархісцкага актывіста, запрасілі ў Гішпанію ў лягер рэвалюцыйнай моладзі, я вельмі ўзрадаваўся. Звычайна гэткія лягеры праводзяць заходнія трацкісцкія арганізацыі, занятыя распаўсюджваньнем у сьвеце ідэй Льва Троцкага.

Гэтыя людзі (дарэчы, зь вялікімі дзівацтвамі) зьбіраюць з усяго сьвету самыя дэструктыўныя элемэнты: панкаў, рэд-скінхэдаў, сындыкалістаў, фэміністак, студэнтаў-экстрэмістаў, сэксуальных «меншавікоў»... Потым яны ўсёй гэтай армадзе даюць імя «сусьветнага рэвалюцыйнага авангарду» і ствараюць для яе лягеры. Відавочна, што наступствы такога кшталту сэмінараў прадбачыць няцяжка, бо, як вядома, ад рэвалюцыйнай тэорыі да практыкі адзін крок. Распавядаюць, што жыхары аднаго невялічкага швэдзкага гарадка, якім хапіла глупства прымаць у сябе мінулую канфэрэнцыю, назаўсёды заракліся галасаваць за левых кандыдатаў.

У гэтым годзе канфэрэнцыю плянавалася правесьці дзесьці ў Пірэнэйскіх гарах. Так бы мовіць, далей ад людзей.

Прыбыўшы ў Гішпанію, мы (я і яшчэ адзін таварыш зь Беларусі) у першую чаргу навешалі макаронных вырабаў на вушы мясцоваму мытніку адносна мэтаў нашага візыту (згодна з запрашэньнем, мы прыехалі на сэмінар маладых альпіністаў). У аэрапорце нас ужо сустракалі таварышы з братніх рэвалюцыйных арганізацыяў.

Сустракаў чыліец П'еро (быў ўдзельнік узброеннага супраціву супраць Піначэта) і нейкі Фэран, які адрэкамэндаваўся як каталёнскі нацыяналіст-марксыст-гомасэксуаліст. Прызнацца, пасьля такога прадстаўленьня я з асьцярогай залазіў у ягоны аўтамабіль, увесь абклеены каталёнскімі нацыяналістычнымі наклейкамі, якія агітавалі не пакінуць каменя на камені ад усёй кастыльскай імпэрыі.

Чырвоны фальксваген пабег па пятлястых аўтабанах Пірэнэяў у горад Х. Там, са словаў Фэрана, нас чакалі на канспіратыўнай кватэры. Кватэрай быў звычайны панкаўскі прытон, якіх вельмі шмат у Эўропе, з абавязковым вазонам у кутку, дзе вырошчваюць марыхуану. Каталёнскія панкі, як і мае быць паводле панкаўскіх законаў гасьціннасьці, пабеглі па піва. Зьявілася піва фірмы «Дамм», на матыў «Жыгулёўскага». Мы размаўлялі па-польску: адзін з жыхароў кватэры калісьці тусаваўся ў Празе з польскімі хіпі, ад якіх і навучыўся «мовіць».

Невядома адкуль зьявіўся П'еро і загадаў зьбірацца ў Барсэлёну. У Барсэлёне нас разьмясьцілі ў офісе адной з лякальных леварадыкальных арганізацыяў. Спаць давялося на падлозе, паклаўшы пад галаву замест падушкі кнігу Л.Троцкага са злавеснаю назвай «Камунізм і тэрарызм». Нарэшце зранку нас загрузілі ў машыну і закінулі на базу, дзе павінна была праходзіць канфэрэнцыя.

Удзельнікі канфэрэнцыі разьмясьціліся ў танным кемпінгу, які знаходзіўся дзесьці ў гарах, за блізкім сьветам. Акрамя нас прыехалі таварышы з Бразыліі, Пэру, Нямеччыны, Францыі... Апошнімі зьявіліся дэлегаты адной надзвычай антыкапіталістычнай групоўкі з францускага Сан-Трапеза (звышдарагі курорт, дзе, між іншым, жыве Брыджыт Бардо са сваімі жывёлкамі). Сан-Трапескія барацьбіты за справу працоўнай клясы ўсе як адзін прыехалі на ўласных «сытраенах» і «пэжо». Падрулiўшы да кемпінгу, яны яшчэ доўга пасьля правяралі з дапамогай радыёперадатчыкаў гермэтычнасьць аўтасалёнаў і надзейнасьць супрацьугонных сыстэм. Напэўна, не давяралі сваім галодным рэвалюцыйным таварышам з Усходняй Эўропы.

Канфэрэнцыя адкрылася звышаптымістычным дакладам таварыша П'еро. Сутнасьць яго зьвялася да таго, што капіталізму ня сёньня-заўтра прыйдзе канец, пра што, дарэчы, Л.Троцкі казаў яшчэ ў 1938 годзе ў артыкуле «Пераходная праграма і задачы IV Інтэрнацыяналу». Публіка добра сустрэла палкі выступ прамоўцы. На гэтым канструктыўная частка канфэрэнцыі скончылася.

Наступны тыдзень пранёсься ў мяне перад вачыма, як сон. Рэвалюцыйны маладняк весяліўся ад душы: ганяў мяч, дэгуставаў напоі, купаўся галышом, балеў за футбольную каманду «Барсэлёна» ў тэлевізары, танчыў... Дарма гаспадар кемпінгу са сьлязьмі на вачах маліў супакоіцца, спасылаючыся на скаргі суседзяў (другую палову кемпінгу займалі нямецкія тынэйджэры з «грамадзкай добраахвотнай дапамогі пажарнікам»). Нязломныя рэвалюцыянэры сьмяяліся яму ў твар і яшчэ гучней цягнулі ў тры гадзіны ночы матыў песьні пра «Чырвоную Армію»:

Ведь от тайги до британских морей
Красная Армия всех сильней!

Гэтай песьні навучылі іх мы — беларуская дэлегацыя. Дарэчы, калі Л.Троцкі быў у фаворы, гэтая песьня мела тады ў СССР зусім іншы рэфрэн:

С отрядом флотским
Товарищ Троцкий
Нас поведёт
В последний бой.

У перапынках паміж куплетамі ўдавалася падыскутаваць наконт актуальных мэтаў сусьветнага левага руху. Дыскусія ў першую чаргу датычылася «маніфэсту Маркаса».

У пачатку 90-х выпускнік Сарбонскага філфаку нейкі Маркас гасьцяваў у мэксыканскіх індзейцаў. Як і належыць усякаму леваку, ён прапагандаваў там сацыялістычную рэвалюцыю. І ўрэшце свайго дамогся. 1 студзеня 1994 году індзейцы мэксыканскага штату Чыяпас пачалі рабаваць мясцовыя вайсковыя склады і абвясьцілі пачатак узброенай герылы (партызанская вайна). Маркас вельмі зьдзівіўся, калі паўстанцы лёгка вызвалілі значную тэрыторыю, а ўрад пайшоў на перамовы. Тут Маркас зусім абнаглеў, абвясьціў сябе «субкамандантэ» і адпісаў усім леварадыкалам сьвету ліст — так званы «маніфэст Маркаса».

У маніфэсьце прапанавалася ўсім левым экстрэмістам —анархістам, антыфашыстам, рэвалюцыйным нацыяналістам і інш. узьяднацца ў адзіны рэвалюцыйны блёк, каб паказаць Клінтану і К° «кузькіну маць». Аб'яднацца, безумоўна, прапанавалася пад кіраўніцтвам Маркаса. Насамрэч разбэшчаныя півам і жанчынамі левыя радыкалы ў якіясь арганізацыі з партыйнымі дысцыплінамі аб'днацца ня могуць. Каб не афішаваць сваю дэструктыўную сутнасьць, яны цяпер выдумваюць нейкія прычыны, каб адмазацца ад надакучлівых і безжыцьцёвых ініцыятываў Маркаса. Наша канфэрэнцыя таксама вырашыла ігнараваць маніфэст, спаслаўшыся на апартунізм Маркаса ў справе аграрнай рэформы на вызваленых тэрыторыях.

Да заключнага паседжаньня арганізатары рыхтаваліся сур'ёзна. З Барсэлёны падвезьлі піва (па-іхняму — «сэрвэса»), ром і брэндзі. Было своечасова вырашана і «рускае пытаньне»: для нас набылі імпартнай «Сталічнай».

Гулялі ўсю ноч. А ўзыход сустрэлі «Інтэрнацыяналам». Гучней за ўсіх сьпявалі юнакі-немцы — «добраахвотныя памочнікі пажарнікаў». Ноччу, насуперак забароне іхняга брандмайстара, яны перабеглі пад нашы рэвалюцыйныя сьцягі.

Пераклаў Сяргей Пульша



кватэр

традыцыю. Адраджаць гэтага нам ня прыйдзецца.

І ўсё пачынаецца зноўку... Ты п'еш гарбату, чытаючы «Рэпартаж з 4-й камэры». Ізноў глушаць «Свабоду»» — «салавей» час ад часу забівае зводку навінаў. Ты клянеш КГБ, які ў апошні час надта актывізаваў сваю дзейнасьць. Непрыемна, калі прыператрусе рэдакцыі газэты канфіскуюць твае матэрыялы. Тым больш непрыемна, калі гэта адбываецца неаднаразова. Менавіта таму ў нейкі час ты шукаеш і знаходзіш канспіратыўную кватэру.

У нас зьявіліся свае дысыдэнты, свае палітэмігранты, свае палітвязьні. Каб ня стаць кімсьці зь іх, ты шукаеш бясьпечнае месца. Канспіратыўную кватэру, дзе можна абмеркаваць усё і напіцца смачнай гарбаты з бутэрбродамі, калі трэба — застацца на ноч. Дзе безь перашкодаў можна вырашыць, як дапамагчы сваім і не сваім дысыдэнтам, абмеркаваць тэкст улёткі, сплянаваць акцыю. А потым падвесьці вынікі гэтай акцыі, узьняць шклянку гарэлкі за тых, хто трапіў у мянтоўку і сплянаваць новую акцыю ў дапамогу і абарону пасаджаных...

Калі ўзьнікне пытаньне, дзе знайсьці такую кватэру... Каб дапамагчы сваім. Каб нашкодзіць ураду. Каб проста паслухаць «варожыя галасы»...

Не хвалюйцеся. Хуткім часам у Беларусі вельмі шмат кватэраў стануць канспіратыўнымі. Тыя, хто на рэфэрэндумах галасаваў «супраць». Тыя, хто ўдзельнічаў у мітынгах і пікетах «рэвалюцыйнай вясны». Яны будуць захоўваць і захаваюць традыцыі.

Краіна канспіратыўных кватэр...

Сяргей Пульпа

ВЫХАД У ГОРАД

Гомель бязь Леніна

Зьміцер Бартосік



Наш горад застаўся бяз помнікаў правадыру. На галоўнай плошчы яго імя ўжо няма ягонай шэрай масыўнай постаці, што служыла каму аб'ектам для паднясеньня ландышаў, каму указальнікам уваходу ў абласны тэатар. Калі замест яе я, нарэшце, заўважыў двухмэтровы бэтонны абгрызак, першай рэакцыяй была не наіўная радасьць, маўляў, — даўно пара. І не філязофскае шкадаваньне па яшчэ адной перагорнутай ілюстрацыі жыцьця. А зьдзіўленьне адсутнасьцю ўсялякай рэакцыі ў горадзе на гэтае зьнікненьне. Хай сабе й часовае (а дакладней, своечасовае — не пасьпеў нікога прыціснуць). Хай яго пераварацъ, перакляпаюць ды заўтра назад паставяць. Але сёньня ж яго няма. Як няма заклапочаных ходам рэстаўрацыі вэтэранаў зь лістамі ў «Гомельскай праўдзе». Ці прыколаў на тэму камандора ў газэце»Джэм». Адно мамы тлумачаць сваім цікаўным стварэньням што «дзядуля Ленін пайшоў пагуляць».

Памятаю, колькі было шуму, калі пагуляць пайшоў першы Лукіч, які правадырыў каля ўнівэрсытэту. Пайшла, дакладней, толькі верхняя частка. Штаны на пастамэнце стаялі яшчэ з тыдзень. Але й іх прыйшлося прыбраць разам зь нераскрытаю справай па акту вандалізму.

Больш моцным арэшкам для мясцовых антыленінцаў аказаўся другі помнік, што ціхенька стаяў на нікому, акрамя яе жыхароў, незаўважнай вуліцы Астроўскага. Калі жыхары аднойчы прачнуліся, то ўбачылі сапраўды жудаснае відовішча. На пастамэнце стаяў бязрукі манэкен. Відаць, адолеўшы толькі адну руку, былыя піянэры ўвайшлі ў такі раж, што не ўстрымаліся, каб не замардаваць колішняга духоўнага настаўніка. Не магу без усьмешкі ўявіць, як адбывалася начная дзея. Зь якім энтузіязмам, потам і ўрэшце сьвірэпым бясьсільлем перад першымі пеўнямі. Але мэта начнога суботніка была дасягнута —уладзе нічога не засталося рабіць, як прыбраць прывіда. Гэты выпадак амаль не выклікаў ні абурэньня, ні захапленьня, стаўшы нібы рэпэтыцыяй сёньняшняга зацішша. Ды і чаго шумець?. Хіба ён можа не вернуцца?

***

А гэтае зьнікненьне заўважыў, напэўна, я адзін. Таму што даўно хацеў набыць партрэт Першага. А калі ўсё ж наважыўся то «цырк зьехаў». Няўжо раскупілі ўвесь тыраж, як сьцьвярджаюць прадаўшчыцы? Каму ж ён яшчэ, акрамя мяне, так спатрэбіўся? Не магу ўявіць. Ужо, здаецца, ва ўсіх кабінэтах вісіць. Ад самога гаспадарскага да капцёркі загадчыка раённай лазьні. Але прыкмета — лепш не прыдумаеш. Наш пакупнік ад любові, хай самай пяшчотнай, раскашэльвацца ня будзе. Ён тонка адчувае час, калі пара ламіцца й хапаць, пакуль не разабралі. Пакуль яшчэ можна пасьпець урваць тое, чаго так хутка ня будзе. Я вось не пасьпеў.

Якая добрая прыкмета! Значыць хутка ня будзе.

Міжнародны камэнтар

Нашчадкам Дракулы

прыходзіцца вырашаць спрэчкі па-эўрапейску

Вугоршчына і Румынія сталі першымі цэнтральнаэўрапейскімі краінамі, што заключылі ўсеабдымнае пагадненьне наконт нацыянальных меншасьцяў. Румынскія вугорцы атрымаюць аўтаномію. Пагадненьне падпісвалі ў Тымішаары зь вялікай помпай. За мурамі палацу наўтоп румынаў роў: «Здраднікі!»

Менавіта ў Тымішаары, горадзе з найбольшым працэнтам мадзярскага насельніцтва, у 1989 годзе выбухнуў першы бунт супраць Чаўшэску, і першым яго падтрымаў каталіцкі і пратэстанцкі клер, што за камуністамі знаходзіўся на паўлегальным становішчы. Дыктатар часта выкарыстоўваў пагрозу «вугорскага шавінізму і сэпаратызму» для ўмацаваньня сваёй улады. Для рэжыму Чаўшэску вугорцы былі замест жыдоў.

Пасьля сьнежаньскай рэвалюцыі вугорцы, якія, у адрозьненьне ад румынскіх дэмакратычных сілаў, згуртавана выступілі на выбарах, сталі найбуйнейшай апазыцыйнай сілай у парлямэнце.

Пасьля крушэньня Аўстра-Вугорскай імпэрыі ад разьдзелу межаў на карысьць пераможцаў ці не найбольш пацярпела Вугоршчына: трэцяя частка мадзяраў апынулася па-за межамі краіны. Трансыльванія, неселеная вугорцамі, немцамі і жабракамі-румынамі, апынулася пад уладай Бухарэста. Яшчэ нядаўна самі — «старэйшыя браты», мадзяры не маглі пагадзіцца са сваім становішчам нацменшасьці. Вугоршчына-мэтраполія, прагнучы вяртаньня страчаных тэрыторыяў, далучылася да фашысцкага блёку.

Першым паспрабаваў пакласьці край бясконцым канфліктам у Трансыльваніі вядомы міратворца Гітлер, які перадаў паўночную частку гэтага краю Хорці, а Бонат пакінуў за Антанэску. Другім заклапаціўся Сталін, вярнуўшы калыску князя Дракулы каралю Міхаю разам з ордэнам Перамогі, але — стварыўшы для вугорцаў аўтаномію.

Таварыш Чаўшэску аўтаномію скасаваў, нацыянальныя суполкі разагнаў, а каб нацмэнам не было гэтак крыўдна, забараніў і румынскую царкву, моцную на Трансыльваншчыне.

Цяперашняе пагадненьне аб вугорскай аўтаноміі краіны падпісалі ня столькі з уласнай добрай волі, колькі пад ціскам новага міратворцы — Захаду, каб атрымаць картблянш на інтэграцыю ў заходнія структуры.

У Румыніі вугорцаў мільёны з паўтара (хоць Будапэшт настойвае на 2 млн., а Бухарэст — на 1 млн.), у Славаччыне іх усяго 700 тыс., але і самой Славаччыны — малы лапік. І ў Браціславе, і ў Бухарэсьце пры ўладзе даволі чырвоныя і даволі папулісцкія ўрады. Праўда, паводле ўзроўню ВНП на душу насельніцтва, Славаччына сярод цэнтральнаэўрапейскіх краінаў саступае толькі Славеніі, а Румынія безнадзейна жабруе ды, у адрозьненьне ад манархічна-дзяржаўніцкіх валаскіх традыцыяў, у браціслаўскім парлямэнце можна сустрэць дэпутатаў, што не валодаюць літаратурнай дзяржаўнай мовай, а толькі дыялектам роднай вёскі. Браціслава (Пожань) не адно стагодзьдзе была сталіцай Вугоршчыны, і яшчэ больш часу мадзяры кіравалі славакамі. Напружанасьць у двухбаковых дачыненьнях ў 90-х гадах ужо ўзьнікала, падмацаваная спрэчкамі вакол вадасховішча на Дунаі, але, звычайна калі ВНП высокі, спрэчкі перамельваюцца.

Праўда, чуласяся, што Вугоршчына ўвойдзе ў NATO, а Славаччына застанецца за брамай. Масква і цяпер зьвяртае не апошнюю ўвагу на Браціславу, а тады і ўвогуле зробіць усё, каб пасварыць вугорцаў і славакаў, балазе ў Славаччыне заўсёды існавала традыцыя прыхільнага стаўленьня да Расеі. Калісьці стваральнік славацкае літаратурнае мовы Шчюр пісаў, што «славянскія плямёны, якія цяпер перабываюць па-за межамі расейскай дзяржавы, калісьці зьяднаюцца з Расеяй у адзінае цэлае».

Не бракуе добразычлівцаў і ў балканскіх краінаў.

Мільёны альбанцаў апынуліся ў межах Сербіі, Македоніі, а цяпер усьцяж па Эўропе, дзе толькі ёсьць праца. Людзі яны хвацкія і зухаватыя; жыцьцё ў гарах і на скрыжаваньні цывілізацыяў прывучыла салідарнасьці, арганізаванасьці, упартасьці і жорсткасьці. Якая яшчэ нацыя ў Эўропе здолела б 30 гадоў трываць выключна на ўласнай кукурузе і гусенічных трактарах? Альбанцы — народ, як кажуць, канкрэтны.

Аднойчы мне пашанцавала пазнаёміцца з альбанцам са Скоп'е і я найперш распавёў яму, што калісьці быў жыў у адным пакоі з двума альбанцамі з Тыраны і таму крыху ўмею па-альбанску. У адказ, на маё прыгаломшаньне, Чэмаль пачаў даказваць, што паміж македонскімі альбанцамі і альбанскімі альбанцамі няма нічога агульнага. Нікому ня хочацца атаесамляць сябе з самай жабрацкай і самай мафіёзнай (стэрэатыпы!) нацыяй у Эўропе.

Аднак, калі ўзгадаць, што тэмпы росту ВНП Альбаніі складаюць сёньня 15%, дык толькі дурны праз 10 гадоў не запросіцца ў склад маці-Айчыны. Знойдзецца і добры дзядзька, каб паднесьці запалку да назапашанага на Балканах арсэналу зброі.

Дванаццацімільённая расейская меншасьць ва Ўкраіне мае школы, унівэрсытэты, тэлебачаньне, акадэмію навук, выдавецтвы, асяродзьдзе і адкрытыя межы з Расеяй. Адзінае, што «Санта-Барбару» паказваюць у «хахляцкім» варыянце. Аднак, ня гэта ім важна. Іхнія жаданьні ўвасобіліся ў патрабаваньні крымскарасейскіх рухаў аб увядзеньні ў Крыме расейскага рубля ў якасьці валюты. І калі яшчэ гады з тры ўкраінская гаспадарка папрацуе гэтак жа кепска, мы будзем пісаць, што Ўкраіна аказалася калёсам на гліняных нагах.

А яшчэ ў Баўгарыі жывуць туркі, у Малдове — савецкія людзі, у Турцыі — курды і рэлігійная меншасьць памяркоўных мусульман, а ўжо ў Расеі — хто толькі не жыве...

Увогуле за апошняе стагодзьдзе Цэнтральная і Ўсходняя Эўропа набылі адзін бясспрэчны досьвед: няма меншасьці — няма праблемы. Гэтым прынцыпам кіраваліся палякі, правёўшы ў 1947 годзе апэрацыю «Вісла» супраць украінцаў, харваты супраць краінскіх сербаў, чэхі ў 1945 супраць безумоўна, безумоўна, вінаватых немцаў.

Адзіная Эўропа хоча выпрацаваць новую практыку, новы досьвед. У рамках адзінай прасторы суіснаваньне нацыянальных дзяржаваў мусіць зьмяніцца суіснаваньнем нацыянальных культураў, супрацоўніцтва краін — супрацоўніцтвам рэгіёнаў. Замест дзяржаваў, занадта малых, каб вырашыць глябальныя праблемы, і занадта вялікіх, каб дачуцца да праблемаў лякальных, мае паўстаць Эўропа рэгіёнаў.

Тыя, хто далучаецца да Эўропы, як Вугоршчына ці Румынія, спадзяюцца, што Эўропа падкажа ім шлях вырашэньня іхных праблемаў. Тых, хто махае Эўропе ручкай, спакушаюць старыя практыкі.

Андрэй Дынько

Украіна — зблізку

«Голас» казаў «шось не це»...

Усярэдзіне верасьня ў Менску распаўсюдзіліся чуткі пра тое, што на Беларусь будзе вяшчаць радыёстанцыя «Голас УНСО» з Кіева.

Натуральна, няпэўнасьць чутак і скандальнасьць рэпутацыі падштурхнулі руку радыёслухача да рэгулятара сярэдніх хваляў. «Голас», сапраўды, быў пачуты, хаця з-за шматлікіх эфірных перашкодаў услухацца як сьлед у зьмест перадачы аказалася надзвычай складана. На ўкраінскай мове дыктар распавядаў пра рэвалюцыйныя сытуацыі і нейкія навіны, што датычыцца Беларусі з Украінаю. Хутчэй за ўсё, шмат хто зь цікаўных слухачоў усё ж вырашыў не пакутаваць і слухаць «Свабоду».

Але неўзабаве «Голас» змоўк. Паводле паведамленьняў замежных СМІ, Генпракуратура Ўкраіны заявіла на радыёстанцыю крымінальную справу — за абразу гонару і годнасьці шэрагу палітыкаў, у тым ліку, Аляксандра Лукашэнкі.

Паводле ўдакладненых дадзеных, служба бясьпекі Ўкраіны канфіскавала ў «Голаса УНСО» апаратуру і касэты з матэрыяламі. Прадстаўнікі УНА-УНСО кажуць пра ціск, аказаны беларускімі ўладамі і іх дзеяньні супраць патрыятычных арганізацыяў увогуле. Украінская служба бясьпекі пацьвярджае інцыдэнт, дадаючы, што адбыўся ён у Львове. Сваёй студыі ва УНА-УНСО не было, а кіраўнікі прыватных станцый перапынілі «кантракт арэнды зь ёй пасьля 3-4 трансляцыяў, таму што зразумелі, што ў эфір трасьлюецца «шось не це, шо трэба». Цяпер гэтая справа кантралюецца львоўскімі «органамі», але казаць пра нейкае сьледзтва пакуль заўчасна — пранамсі, у прэс-цэнтры СБУ зьвестак пра яго ня маюць.

Днямі ў тым жа Львове пасьля двухгадовай «адсідкі» ў СІЗО былі асуджаныя на 3 і 4 гады зьняволеньня два сябры УНА-УНСО за хуліганства і супраціў работнікам міліцыі падчас спрэчкі ў адным з львоўскіх бараў. У часе спрэчкі міліцыянты некалькі разоў стрэлілі ў паветра і выпадкова застрэлілі аднаго з наведнікаў бара, які аказаўся сябрам УНСО.

Да УНА-УНСО, вядома, можна ставіцца вельмі па-рознаму. Як і да таго, што гэтая абрэвіятура ўсё часьцей згадваецца ў дачыненьні да Беларусі. Дыяпазон ацэнак і адносінаў вызначаецца скрайнасьцямі, а скандальная рэпутацыя даўно выклікала цікавасьць да арганізацыі далёка за межамі краіны «прапіскі». Ня дзіўна, што, знаёмячыся з адметнасьцямі ўкраінскіх гарадоў, сёй-той успамінае і пра гэтую скандальную адметнасьць...

Наша гутарка — зь Дзьмітро Карчынскім, адным зь лідэраў і, як яго называюць, «правадніком» УНА-УНСО.

Дзьмітро Карчынскі:

«Крайнія хаты заўжды гараць першымі»...



— Дзьмітро, ня так даўно ваша дзяржава атрымала прынятую пад час «усяночнага» паседжаньня парлямэнту Канстытуцыю. Як вы яе ацэньваеце?

— Увогуле, я прыхільнік Прудона, які сказаў, што ўласнасьць — крадзёж, а канстытуцыя — брэхня... Гэтая Канстытуцыя нічым ня горшая за ўсе іншыя. Для УНА-УНСО яна дае магчамасьці замацоўваць свае пазыцыі ва Ўкраіне легальнымі мэтадамі.

— Такім чынам, збору законаў арганізацыя падпарадкоўваецца?

— Так, безумоўна. Мы дзейнічаем у Канстытуцыйным полі Ўкраіны.

— Чаму тады газэты, нашыя і расейскія, стракацяць зьвесткамі пра тое, што УНА-УНСО — незаконная стуктура?

— Справа ў тым, што апошні год паказаў, што мы мусім змагацца незаконнымі метадамі. Беспадстаўныя арышты, няправедныя суды, пастановы дзяржаўных органаў, якія ня маюць юрыдычнай сілы і тым ня менш выконваюцца дзяржаўнымі чыноўнікамі. Большую частку свайго існаваньня УНА-УНСО дзеіць, скажам так, між законамі. Не па-за законам, але між законамі. У канцы 94-га УНА была зарэгістраваная як палітычная партыя Міністэрствам юстыцыі Ўкраіны. Увосені 95-га Мінюст пазбавіў нас рэгістрацыі. Незаконна, паколькі такога кшталту акты, паводле законаў Украіны, мае права разглядаць і прымаць толькі Вярхоўны Суд.

— На якой падставе адбылося гэтае пазбаўленьне?

— Мінюст сказаў, што папярэдняе рашэньне было памылкаю. Гэта ўсё роўна што ЗАГС зарэгіструе ваш шлюб, а праз год скажа, што адбылася дужа прыкрая памылка ў дакумэнтах, што нешта было ня так пададзенае, і абвесьціць ваш шлюб несапраўдным.

— І ўсё ж, як гэта патлумачылі ў Мінюсце?

— Былі якіясь пагрэхі і, высьвятляецца, памылка ў дакумэнтах. Гэта было фармальнай прычынай. Рэальнай прычынай стала тое, што УНА-УНСО паступова набірае сілу і, напэўна, рэжым разглядаў яе як рэальную палітычную пагрозу.

— Цяперашняй уладзе?

— Так.

— Вы сказалі «рэжым», але ў некаторых выклікае шокавую рэакцыю ваш лёзунг — «Слава нацыі!» Часам у гэтым бачыцца сувязь з фашызмам... Ці маюць яны рацыю?

— Я ня раз казаў: фашызм ва УНА-УНСО гэтак жа цяжка знайсьці, як свастыку на даляры. Нічога фашысцкага тут няма. Наколькі я ведаю, нацысты ў Нямеччыне карысталіся іншай сымболікай і іншымі мэтадамі. Нацыя — гэта значыць, сам народ, яго найбольш сьвядомая частка. Ня проста група людзей, якім усё роўна, што рабіць, на якой мове размаўляць, каму служыць —абы грошы...

— Дзьмітро, мне распавядалі пра вас цікавую гісторыю. У 86-м ці 87-м годзе вы паднялі жоўта-блакітны сьцяг і сказалі, што хутка ён будзе разьвявацца над Вярхоўнай Радай. А потым, калі гэта адбылося, — што гэта Ўкраіна ня мае незалежнасьці.

— Гэта несапраўдная незалежнасьць. Проста да ўлады прыйшлі кар'ерысты...

— Тады вы паднялі новы сьцяг і сказалі, што хутка ён будзе разьвявацца над рэвалюцыйнай Эўропай. Так? Прабачце, але рэвалюцыі і «сусьветны пажар» — гэта было...

— Рэвалюцыя — гэта ня значыць стварыць дзяржаву неабсяжных памераў, дзе ўсе гаварылі б па-ўкраінску. Хаця мы і мусім навязваць у пэўнай ступені сваю мову, культуру і мэнтальнасьць — але інакш нам нехта навяжа сваю.

— Вы пра Расею?

— Расею. Амэрыку. Каштоўнасьці чужых сьветаў нам патрэбныя як трафеі. Няхай вас не палохае гэтае слова. Свае іконы трэба маляваць самім — ніхто іншы гэтага ніколі ня зробіць. Расейскі народ — ня вораг, мы да яго вельмі добра і з разуменьнем ставімся, паколькі ягоны ўрад свой народ проста выкарыстоўвае. Урэшце, мы ўсе славяне, усе ходзім па берагах адных рэк, носім адны й тыя ж кітайскія штаны ды слухаем адзін і той жа рэп. Але сытуацыя абавязвае аб'яднаць славянскія культуры, і абноўленая Ўкраіна можа зрабіць гэта найлепей...

— Як вы ставіцеся да падзеяў у Беларусі?

— Беларусы — нашыя найбліжэйшыя родзічы. Мы ня можам назіраць за іх лёсам абыякава, асудзіць іх на тое, што над імі вызначылі... Відаць, будзем браць удзел ва ўсіх беларускіх падзеях. І думаю, што супольнымі сіламі нам удасца пазбавіць беларускую зямлю ад палітыкаў, якія варожа настроеныя да беларускай традыцыі. Яны будуць прасіць прытулку ў Амэрыцы.

— Альбо ў Маскве?

— Я думаю, што Лукашэнка будзе прасіць прытулку ў Амэрыцы. Традыцыя такая ў беларускіх дзеячаў: цяпер Пазьняк, потым Лукашэнка... Палітыка — гэта як крыжовы паход за ідэю. За ідэю часам варта і сесьці ў турму.

— Дзьмітро, адзін расейскі палітык, паплечнік Лебедзя ў Прыднястроўі, узгадваў вас як «вельмі разумнага чалавека», хаця, здаецца, вы зь Лебедзем у адным лягеры там ніколі не былі. Цяпер зь імем Лебедзя зьвязаная Чачэнія, дзе таксама ваша хата ня з краю...

— Хаты, што з краю, заўсёды гараць першымі, а размова ідзе пра інтарэсы, якія мае незалежная Ўкраіна... Не абавязкова ваяваць супраць фэдэральных войскаў. Калі заўтра, да прыкладу, Белы дом у Маскве акружаць танкі з Чачэніі ці іншай краіны, мы будзем бараніць Белы дом з расейцамі...

— У такім разе тэарэтычна магчымае і супрацьстаяньне зь Беларусяй?

— Ну... Не, я асабіста не магу гэтага ўявіць. Беларусь патрэбная нам як нэўтральная і незалежная дзяржава, зь якой будзем мець прыярытэтныя дачыненьні.

Тацяна Сынгко


№ 27/96
7 — 13 кастрычніка

Інфарматар
НАША НІВА

Новае слова на рынку беларускае прэсы — штотыдзень 8 палосаў патрэбнае інфармацыі

ШТОТЫДНЁВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ДАДАТАК ДА ГАЗЭТЫ НАША НІВА

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ BELARUSIAN PUBLIC RELATIONS ASSOCIATION



Тэст: Батарэйкі. На беларускім рынку ўжо даўна зьявілася прадукцыя новых замежных фірмаў, апе радзей стала сустракацца прадукцыя вытворчасьці краінаў СНД. Кошты на расейскія элементы і батарэйкі павялічыліся ў 2-2,5 разы, на імпартовыя - у 6 і больш разоў, дагнаўшы, а часам і перавысіўшы кошты такіх "дарагіх" эўрапейскіх краінаў як Бэльгія і Швайцарыя.

Глядзі стар. 7

Дыпляматычны корпус у Менску

1. Пасольства Рэспублікі Баўгарыя
Адрэса: Бранявы завулак, 5. Тэлефон: 27-55-00, 27-55-02. Факс: 36-56-61. Тэлекс: 25-21-84. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп.Марка Ганчаў Марынаў.

2. Пасольства Фэдэратыўнай Рэспублікі Нямеччына
Адрэса: вул.Захарава, 26. Тэлефон: 33-07-52, 22-27-14, 33-42-17. Факс: 36-85-52. Тэлекс: 25-22-72. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Готфрыд Альбрэхт. Консульскі аддзел: Адрэса: вул.Старавіленская, 44. Тэлефон: 34-00-87, 34-26-47.

3. Пасольства Рэспублікі Індыя
Адрэса: вул.Кальцова, 4, корп. 5. Тэлефон: 62-93-99. Факс: 62-97-99. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Рамэш Чандра Шукла.

4. Пасольства Італьянскай Рэспублікі
Адрэса: вул.К.Маркса, 37. Тэлефон: 29-20-01/20/22, 29-29-69. Факс: 34-30-46. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Джан Лука Бэртынэта.

5. Пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі
Адрэса: вул.Берасьцянская, 22. Тэлефон: 22-44-95, 22-45-00. Факс: 22-44-96. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Чжао Сідзі.

6. Пасольства Рэспублікі Польшча
Адрэса: вул.Румянцава, 6. Тэлефон: 33-02-60, 33-13-13. Факс: 36-49-92.

7. Пасольства Румыніі
Адрэса: зав.Масквіна, 4. Тэлефон: 23-80-97. Факс: 8-0172-10-40-85. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Нікалаэ Стыня.

8. Пасольства Злучаных Штатаў Амэрыкі
Адрэса: вул.Старавіленская, 46. Тэлефон: 31-50-00, 34-77-61. Факс: 34-78-53. Тэлекс: 52481 USARB SU. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Кэнэт Спэнсэр Ялавіц.

9. Пасольства Турэцкай Рэспублікі
Адрэса: вул.Кірава, 17. Тэлефон: 27-13-83, 27-14-08. Факс: 27-27-46, 76-86-74. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Тансу Акандан (дуаэн).

10. Пасольства Францускай Рэспублікі
Адрэса: пл.Волі, 11. Тэлефон: 23-62-29, 26-75-22. Факс: 8-0172-10-25-48. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Клёд Жаліф.

(працяг у наступным нумары)

Бясплатныя прыватныя абвесткі

КАНТАКТЫ

Малады беларускі хлапец шукае патрыётаў і Партыю Свабоды. Сьветлагорск, тэл. **3-53-84,** Сяржук.



Памятаеце "Магістрат"? Адгукніцеся, хто мае запісы гэтага гурта, каб папоўніць "Залаты фонд беларускага рок-н-ролу".
Тэл. 70-01-87

ШУКАЮ ПРАЦУ

Электронік, сыстэмамэханік, праграміст — рэпарацыя, абслуга ПК і пэрыфэрыі; ASM86, Pascal, FoxPro, English.
Тэл. 364-518

ПРАФЭСІЯНАЛЫ

Спэцыяліст: кансультацыі, справаздачы прадпрымальнікам. 249-76-54 пасьля 17.00. Яна.

ВІНШУЮ!

Рытачка Капілава! З Днём Анёла! Шчасьця, здароўя, выдатнай вучобы!
Міхась Маліноўскі

Прадаю запісы Алена, Андруся Мельнікава, Данчыка, Ліцьвіноў, "Нейродюбель" і інш. Тэл. 490-888

ДЗЯКУЙ

Вялікі дзякуй усім паэтам за іх цудоўныя вершы ў "Ґрамафоне".
Счасная Натальля

Запрашаем
у беларускамоўнае асяродзьдзе для зьняцьця нерашучасьці ва ўжываньні роднай мовы. Даведкі штосерады з 18 да 20 гадзінаў.
Тэл. 265-74-12

"Маладзёжны клюб" газэты "Народнае слова" навязвае кантакты (210601, Віцебск, вул. Гогаля, 17, "Народная слова", Бынькоўскі Алесь. Тэл. 41-65-51

Жадаю гурту "Камэлот" стаць беларускім "The Pogues"

Прадаю *электрычную друкавальную машынку "Ивица" у выдатным стане.* ***Тэл. 242-79-76 з 19.00 па 22.00. Дзіма.***

Матэматыка. Індывідуальная падрыхтоўка ў БДУ і БДЭУ. Кансультацыі студэнтам. Праводзіць дацэнт. Тэл. 226-78-19

Куплю старыя фотаапараты.
Тэлефон у Кобрыні: **7-17-76 (01642).**

ПЕРАКЛАДЫ

Ангельская, расейская, польская мовы: *пераклады якой заўгодна складанасьці, індывідуальныя заняткі.*
Тэл. 221-24-81

КУПОН
Бясплатнай прыватнай абвесткі

Імя і прозьвішча ____________________

Адрэса, тэлефон ____________________

Тэкст: ____________________

9.55, 11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 20.55 Інфарм ТБ.
10.10 Овэртайм.
10.35 "Пасланьнік Папы ў Марыбо". Т/ф.
11.10 Храм.
11.40 Увесь гэты цырк.
12.10 "Дон Кіхот". М/ф.
13.45 Мультфільм.
14.10 Яшчэ адна Расея.
15.10 Шэдэўры расейскай харэаграфіі.
16.10 Спартовая праграма.
16.35 Дзіцячае ТБ: "Палацавая музыка", Казка за казкай.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Скарбы Пецярбурга.
19.20 "Сама нявіннасьць". М/ф.
21.10 Ноў смокінг.
21.55 Міжнародны агляд.
22.25 "Мужчына лёгкіх паводзінаў". М/ф.

IV КАНАЛ, НТБ

7.00 М/ф "Цудоўныя гады" .
7.50 Сэрыял "Любоўныя повязі-1".
8.45 Лятьнаманія.
9.00, 13.00 Сёньня.
9.15 М/ф "Вялікія паветраныя гонкі".
12.25 Д/ф "Вайсковыя начальнікі. Эрвін Ромэль. Фэльдмаршал нямецкага войска".
12.50 Доктар Угал.
13.15 "Злачынца несамхоць".
14.05 Надоечы.
14.45 Лялькі.
16.05 Хатнія гадаванцы.
16.25 Пад'ём пераваротам.
17.00 "Горац".
17.30 Тэлегульня "Сто да аднаго".
18.00 Сёньня.
18.30 "Чалавек у масцы".
19.10 "Зьніклыя цывілізацыі".
20.00 Вынікі.
21.10 М/ф "Кінг Конг жывы".
23.05 Зоркі сусьветнага кіно ў Маскве.
23.40 Лепшыя шоў і вар'етэ сьвету. "Грандыёзны Мулен Руж".

7.10 – 13.10

КІНО. МЕНСК

АЎРОРА *(Прытыцкага, 23, тэл. 533-360, 533-361)* – Памерці за... 7-13 — 18.30, 20.30 Мэлядрама на экране: Жанчына францускага лейтэнанта, 8-13 — 16.30 Для дзяцей: Прыгоды рудага Майкла, 7-9 — 14.30 Віця Глушакоў — сябра апачаў, 10-13 — 14.30

БЕРАСЬЦЕ *(пр. газэты "Праўда", 25, тэл. 728-660, 716-888)* – Махнаты сэрцаед-2, 7, 9-10 — 16.10, 19.20; 8 — 16.40, 19.50; 11-12 —15.40, 17.20; 13 — 18.00 Назіральнік жарсьці, 7, 9-10 — 17.50, 21.00; 8 — 18.20, 21.30; 11-12 — 19.00; 13 — 19.50, 21.10 Інфармацыйна-забаўляльная праграма, 11-12 — 20.30 Для дзяцей: Чараўнік Смарагдавага гораду, 8 — 10.00; 9 — 10.00, 11.30, 14.30; 10 —11.30; 11-12 — 14.30 Чынгачгук — Вялікі Зьмей, 7, 10, 13 — 14.30; 8 — 15.00; 9 — 13.00 Дыскатэка для дзяцей, 13 — 16.00

ВІЛЬНЯ *(Каліноўскага, 55, тэл. 655-262)* – Сьмяротны танец, 7-13 — 15.10 (ільготны — 13-га), 21.20 Маладая лэдзі Чатэрлей (эратычны фільм), 7-13 — 16.50, 18.20, 19.50 Інфармацыйна-забаўляльная праграма "Усьмешка", 8, 12-13 — 21.00 Альтэрнатыўная дыскатэка 10 — 21.00 Танцавальны вечар "Для тых, каму за 30" 11 — 20.30 Кіна-дыска-шоў для падлеткаў 13 — 15.00

ЗЬМЕНА *(Даўгабродзкая, 4, тэл. 353-903)* – Кінапраграма па прафілактыцы СНІД: Дакумэнтальны фільм. Аварыя — дачка мянта (мастацкі фільм). Выступленьне спэцыялістаў рэспубліканскага цэнтру прафіляктыкі СНІД. 16.00; 8, 10 — 14.00

Відэасалён Разборка ў Бронксе Рэж. Стэнлі Тонг, у ролях — Джэкі Чан, Аніта Муі, Франсуа Ўіп. Баявік 1995 г. 7-13 — 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00

КАМСАМОЛЕЦ *(Жылуновіча, 39, тэл. 454-194)* – Кроўныя повязі, 7-13 — 12.00, 19.00, 20.30 Тыдзень палітычнага фільму: Я служыў у ахове Сталіна, 7-13 — 17.00 Падвойны абгон, 7-13 — 16.20, 20.20 Выпадак у квадрацe 36-82, 7-11 — 15.00; 12-13 — 13.00, 15.00 Заля індыйскага фільму: Артыст (2 сэрыі), 7-13 — 14.00, 18.00 Для дзяцей: Кацялок і нос бульбінай, 7-8 — 10.20, 13.00 У сьвеце казак (кінаклюб), 9 — 10.30, 13.00 Мультфільмы, 12-13 — 11,00 Прынцэса-паўлін, 12-13 — 10.30

КАСТРЫЧНІК *(пр. Ф.Скарыны, 73, тэл. 329-325, 329-429)* – Вандроўная куля, 7-11 — 14.00, 17.20, 19.20; 12 — 14.00 (ільготны), 15.40, 17.20, 19.20; 13 — 14.00 (ільготны), 15.40, 19.00 Фірма, 7-13 — 20.40 Тыдзень швайцарскага кіно: Ягняты, 13 — 17.20 Макс-шоў (тэл.232-60-38) 7-13 — 22.00

КІЕЎ *(бульвар Шаўчэнкі, тэл. 373-270)* – Падстаўная асоба, 8-11, 13 — 15.00; 12 — 15.00 (ільготны) Дэльта Вэнэры, 8-13 — 16.50, 18.40, 20.30 Відэапаказ, 7-13 — 10.00, 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00 Для дзяцей: Сьледапыт, 8 — 13.30 Лятучы карабель (мультфільмы), 13 — 13.30

МАСКВА *(пр. Машэрава, 13, тэл. 231-448, 231-533)* – Барханаў і ягоны целаахоўнік, 7-11 — 17.20, 21.00; 12 — 19.20; 13 —17.50, 21.30 Правая і левая рукі сатаны ("Мяне завуць тройца"), 7-11 — 19.10; 12 —17.30, 21.10; 13 — 16.00, 19.40 Фільм для сямейнага прагляду 12 — 16..00 (ільготны); 13 — 14.30 (ільготны) Для дзяцей: Дыскатэка "Лімпапо" 13 — 12.00

МІР *(Казлова, 4а, тэл. 333-771)* – Псы пекла (новы стэрэаскапічны трылер), 7-10 — 14.00, 16.00, 320.00; 11 —14.00, 16.00,, 18.00, 19.30; 12-13 — 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 19.30 У ложку з ворагам, 7-10 — 13.00, 15.00, 21.00; 11-13 — 13.00, 15.00 Паліцыянт з Бэвэрлі-Хілз, 7-13 — 15.00, 19.00 Інфармацыйна-забаўляльная праграма 11-13 — з 20.00 па 23.00

ПАРТЫЗАН *(Талбухіна, 18, тэл. 663-526)* – Дасканалыя бандыты ("Робін Гуд: Мужчына ў трыко"), 7-9, 11-13 — 16.00, 19.20; 10 — 16.00 (ільготны), 19.20 Каханьне і магія, 7-13 — 17.45, 21.10

ПЕРАМОГА *(Інтэрнацыянальная, 20, тэл. 237-245)* – На халяву, 7-13 — 15.00 Цыганскія вочы, 7-11 — 17.00 Казка на ноч, 7-11 — 19.00 Інфармацыйна-забаўляльная праграма для дзяцей і падлеткаў 13 — з 16.00 па 18.00 Дэнс-шоў 11-12 — з 24.00 па 6.00 Тыдзень швайцарскага кіно: Людзі порта (рэжысэр Ален Танэр). Фэерман (дакумэнтальны фільм), 12 —17.00 Ягняты (Марсэль Шупбах). Каханьне (дакумэнтальны фільм), 12 — 19.00 Вандраваньне надзеі (рэжысэр Ксаўе Капер), 13 — 17.00 Енач (рэжысэр Даніэль Шміт). Семдзесят восем тураў (дакумэнтальны філь), 13 — 19.00

ПІЯНЭР *(Энгельса, 20, тэл. 278-945)* – Кароль вуліцаў, 7-9 — 13.00, 17.00; 10-11 — 13.20, 17.00; 12-13 — 15.10, 19.000 Мужчынскі абярог, 8-9 — 15.00, 19.00; 10 — 19.00; 12-13 — 17.00 Для дзяцей: Ералаш, 7-9 — 10.00 Казка пра цара Салтана, 7 — 15.00 Вялікі прыз, 7-9 — 11.30 Палёт навігатара, 10 — 10.00; 11 — 10.00, 15.00; 12-13 — 12.00 Залаты цюлень, 10 — 11.40, 15.00; 11 — 11.40; 12-13 — 13.40 Лятучы карабель (мультфільмы), 12-13 — 10.30

РАДЗІМА *(Лізы Чайкінай, 16, тэл. 426-779)* – Паварот лёсу, 7 — 15.00 (ільготны), 18.40, 20.20; 11-13 — 15.00, 18.40 Вялікі шпацыр (2 сэрыі), 7, 9-13 — 16.40 Відэазаля: Лялькі палоняць Манхэтэн (для дзяцей), 9-13 — 16.00 Таемныя сяброўкі, 9-13 — 18.00 Крывавы шлюб, 9-13 — 20.00 Музычна-забаўляльная відэапраграма 9-10 — з 18.00 па 22.00 Музычна-забаўляльная праграма 11-13 — з 19.00 па 24.00 У кінатэатры працуе відэа-бар Для дзяцей: Памылка старога чараўніка, 9-10 — 10.30; 12-13 — 14.00

РАКЕТА *(Рабочы зав., 3, тэл. 260-620)* – Амаральныя гісторыі, 7-10 — 17.00, 20.30; 12-13 — 16.20, 19.50 Камэдыя старога рэжыму, 7-10 — 18.50; 12-13 — 18.10 Восеньскія званы, 12-13 — 15.00 Відэапаказ 7-9 — 16.50, 19.00; 12-13 — 15.30, 17.40

САЛЮТ *(пр. Ракасоўскага, 150а, тэл. 474-167)* – Праз каналізацыю, 7-11 — 16.00, 19.30; 12-13 — 14.00, 17.30, 20.50 Каманда, 7-11 — 17.50, 21.10; 12-13 — 15.50, 19.10 Начны танцавальны рух 11-12 — з 21.00 па 6.00 Для дзяцей: На гары стаіць гара, 7-8 — 14.00

СУЧАСЬНІК *(Харкаўская, 70а, тэл. 515-563)* – Маладая лэдзі Чатэрлей, 23-24, 26, 29 – 16.30, 18.00, 21.20; 25, 27-28 – 16.30, 18.00 Гудзонскі ястраб, 23-24, 26, 29 – 19.30 Інфармацыйна-забаўляльная праграма "Аранжык", 25, 27-28 – з 20.00 да 23.00 Для дзяцей: Паліцэйскі сабака, 26, 28 – 14.30 Кінг Конг жывы, 29 – 14.30

СЬЦЯГ *(Вялікаморская, 3, тэл. 211-009)* – Шукальнікі прыгодаў, 7-8, 11 — 16.10; 12-13 — 14.10, 16.10 Гудзонскі ястраб, 7-8, 11 — 18.00; 12-13 — 12.00, 18.00 Парыскія гарэзьніцы, 7-8, 11-13 — 20.00 Для дзяцей: Пра тыграня, якое нічога не баялася, 13 — 10.40

УДАРНІК *(Жукоўскага, 15б, тэл. 259-630)* – І спаны бываюць няверныні, 23-24, 29 – 17.10; 28 – 15.30 Пад мянушкай "Зьвер", 23-24, 29 – 15.30; 25, 28 – 17.20 Танцор дыска (2 сэрыі), 23-24, 29 – 18.50; 25, 28 – 19.00

ЭЛЕКТРОН *(Казінца, 117, тэл. 789-563)* – Жандар і жандармэткі, 23-29 – 12.40, 17.40 Ваўчыца, 23-29 – 14.20, 19.20 Бэстыя ў чорным, 23-29 – 16.00, 21.00 Для дзяцей: Крот і мэдыцына (мультфільмы), 28-29 – 11.30

ВІДЭАСАЛЁН:
"Касьмічныя пехацінцы". Рэжысэр Джон Вэйднэр, у ролях – Білі Ўірт, Эдвард Альбэрт, Мэг Фостар. ЗША. 1996 г.
Фантастычны баявік пра барацьбу касьмічных дэсантнікаў з тэрарыстамі.
23-29 верасьня – 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00

ВІДЭА 7 кастрычніка 1996 г.

НОВЫЯ ФІЛЬМЫ:

1. "НІКА-9: МАЛАНКАВЫ ЧАЛАВЕК-ТАЯМНІЦА"

1996, 90 хвіл, +++, The Glimmer Man; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў <R>. Рэж. Джон Грэй, у р. Стывэн Сыгал, Мішэль Джонсан, Боб Гантан. Паліцэйскі баявік-трылер.

2. "РАСЕЙСКІ ХРОСТНЫ БАЦЬКА"

1996, 89 хвіл, ++1/2, The Russian Godfather; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў <R>. Рэж. Ёрга Агняноўскі, у р. Ёрга Агняноўскі, Джэф Канавэй. Клясычны паліцэйскі баявік з "расейскім" калярытам.

3. "ПАД ПРЫЦЭЛАМ"



1996, 90 хвіл, ++1/2, Silent Trigger; узроставае абмежаваньне: ад 16 гадоў <R>. Рэж. Расэл Малкэй, у г. р. Дольф Лундгрэн. "Снайпэрскі" ўбойны відовішчны баявік са шчасьлівым "хэпі-эндам".

4. "СЬМЕРЧ"

1996, 112 хвіл, +++1/2, Twister; узроставае абмежаваньне: ад 13 гадоў <CP>. Рэж. Ян Дэ Бонт ("Хуткасьць"), прадуцэнт: Стывэн Сьпілбэрг, у р. Біл Пэкстан, Хэлен Хант, Кэры Элвіс, Джэймі Гэрц.

Супэртрылер, зборы ў ЗША і Канадзе звыш 250 млн.$! Упершыню праходзіць з добрай якасьцю.

5. "СЭРЦА ДРАКОНА"



1996, 100 хвіл, +++, Dragonheart; узроставае абмежаваньне: ад 13 гадоў <CP>. Рэж. Роб Коэн, у р. Дэніс Куэйд, Щон Конэры, Джулія Крысты, Дэвід Т'юліс. Фантастыка-баявік-прыгоды, зборы ў кінапракаце перавысілі адметку ў 52 млн.$!

6. "ЭНЭРГІЯ, ЯКАЯ ЗАПАЛЬВАЕ"

1996, 85 хвіл, ++1/2, Spicieman; узроставае абмежаваньне: ад 13 гадоў <CP>. Рэж. Джон Брэдшоў, у р. Марк Пол Гасэпяр, Даг О'Кіфі.

АКРАМЯ ТАГО: /у Менску ў добрай якасьці зьявіліся/:

"Хлопцы з бака для сьмецьця" (камэдыя; Garbade Pail Kids. У р. Энтані Ньюлі);

"Выспа скарбаў Мапэтаў" (прыгоды; Muppett Treasure Island. У р. Тым Кары. Зборы ў кінапракаце Амэрыкі склалі 32 млн.$!);

"Зафарынас" (баявік; Zafarinas. У р. Марыя Баранка, Оскар Ладойр);

"Кветка майго посьпеху" (камэдыя; Flower of My Secret. У р. Розі Дэ Пальма.

Зборы ў кінапракаце — звыш 5млн.$);

"S.O.D: Live in Budokhan" (відэакліпы);

"Gary Moore: Clips" (відэакліпы).

*Выкарыстана інфармацыя агенцтва "Гоблін-прэс".

Падрыхтаваў Мікалай КАВАЛЕЎСКІ

ПРЫСАДА "ЗАЛАТОЙ АНТЫЛОПЫ":

— Працуючы над фільмам "Тытанік", каторы разам здымаюць студыі 20th Century Fox і Paramount, рэжысэр Джэймс Кэмэрон ужо плянуе свой наступны праект. Ім можа стаць стужка "Аватара"/"Ўцелаўленьне боства" (Avatar), у якой будуць зьнятыя сынтэтычныя акторы. Гэта значыць, Кэмэрон, працягваючы свае наватарскія пошукі ў вобласьці сучасных кінатэхналёгіяў, вырашыў аддаць шэсьць галоўных роляў не жывым, а фотарэалістычным выканаўцам, чые вобразы будуць створаныя пры дапамозе кампутарнай графікі (GI). Праўда, выглядаць яны павінны як рэальна існуючыя людзі.

— У Маямі пачаліся здымкі новага фільма Абэля Фэрары "Страта сьвядомасьці" (The Blackout). Герой гэтага трыпераадпойчы ўвечары напіваецца да страты сьвядомасьці. Ачуняўшы, ён даведваецца пра сьмерць свайго лепшага сябры, у забойстве якога яго падазраюць. У галоўнай ролі — Мэцью Модын, а кампанію яму складаюць Дэніс Хопэр, Бэатрыс Даль і Клаўдыя Шыфэр.

— Знакамітая акторка Фэй Данаўэй ("Боні і Клайд", "Дон Жуан Дэ Марка") знайшла ў сваёй шафе стары шэры мужчынскі гарнітур і аддала яго бяздомнаму, зь якім яна пазнаёмілася на вуліцы. На наступны дзень гэты чалавек прыйшоў да акторкі, каб вярнуць ёй знойдзены ім у гарнітуры папернік з грашыма. Фэй высначыла, што ягоным гаспадаром быў нейк Джэк Нікалсан і вярнула папернік сумленнаму чалавеку са словамі: "Не хвалюйся, дарагі! Ён за ім ужо ніколі ня вернецца".

ДЗЯСЯТКА САМЫХ КАСАВЫХ ФІЛЬМАЎ

на канец верасьня ў кінатэатрах ЗША:

1. "Клюб першых жонак" (First Wives Club)	$ 19.1 млн.
2. "Адзінка" (Last Man Standing)	$ 7.1 млн.
3. "Палёт назад дадому" (Fly Away Home)	$ 3.8 млн.
4. "Максымум рызыкі" (Maximum Risk)	$ 3.0 млн.
5. "Яго не бяруць кулі" (Bulletproof)	$ 2.4 млн.
6. "Першае дзіця" (First Kid)	$ 2.3 млн.
7. "Кубак з бляхі" (Tin Cup)	$ 1.8 млн.
8-9. "Час забіваць" (A Time To Kill)	$ 1.6 млн.
"Жонка багача" (The Rich Man's Wife)	$ 1.6 млн.
10. "Дзень незалежнасьці" (Independence Day)	$ 1.5 млн.

Тэатры 7-14 кастрычніка

ПАЧАТАК У 19.00

ТЭАТАР-СТУДЫЯ КІНААКТОРА

8 аўторак, 9 серада — Е.Міровіч. Тэатар купца Япішкіна.

11 пятніца, 12 субота — Айсэдора. Танец каханьня.

ТЭАТАР САТЫРЫ І ГУМАРУ "ХРЫСТАФОР"

11 пятніца, 24 чацьвер — Добра сядзім. Эстрадна-сатырычная імпрэза.

12 субота, 23 серада — Трэцім будзеш? Безалькагольныя гутаркі з гледачом.

13 нядзеля — Кавалеры запрашаюць дам. Шансаньe — Анатоль Длускі.

ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТАР МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

9 серада — І.Кальман. Прынцэса цырку. Апэрэта ў 3 дзеях.

10 чацьвер — І.Кальман. Сыльва. Апэрэта ў 3 дзеях.

11 пятніца. А.Шарамецеў. Бяда ад пяшчотнага сэрца. Вадэвіль у 2 дзеях.

12 субота — Л.Мінкус. Дон Кіхот. Балет у 2-х дзеях.

13 нядзеля, вечар —Ё.Штраўс. Ноч у Вэнэцыі. Карнавал у 3 дзеях.

13 нядзеля, раніца — С.Баневіч. Трывалы алавянны салдацік. Музычная фэерыя ў 2 дзеях.

ДЗЯРЖАЎНЫ РАСЕЙСКІ ТЭАТАР ІМЯ М.ГОРКАГА

9 серада — Ж.-Ф.Рэньяр. Адзіны спадкаемца. Камэдыя ў 2-х частках.

10 чацьвер — І.Губач. Ад'ютант Ягонай Сьветласьці. Камэдыя ў 2-х частках.

13 нядзеля — Д.Мережкоўскі. Хрыстос і Антыхрыст. Трагедыя ў 2-х частках.

Для дзяцей

13 нядзеля — С.Кавалёў. Драўляны рыцар. Фэерыя ў 2-х частках.

Малая сцэна

8 серада — І.Бар-Іосэф. Цяжкія людзі, ці жаніх зь Ерусаліма. Нешта накшталт камэдыі ў 2-х частках.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТАР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

14 панядзелак — Ю.О'Ніл. Лэдзі Нявіннасьць. Трагікамэдыя ў стылі блюз з адным антрактам.

7 панядзелак — М.Захаранка. Паехалі!.. Нябоская камэдыя ў 2-х дзеях,

паводле твораў М.Крапіўніцкага.

9 серада, 10 чацьвер — В.Дунін-Марцінкевіч. Ідылія. Пастараль у 2-х дзеях.

11 пятніца, 12 субота — Прэм'ера.. Ф.Дзюрэнмат.

Ромул Вялікі. Гістарычна недакладная камэдыя ў 2-х дзеях.

13 нядзеля — Э.Эліс, Р.Рыз. Умовы дыктуе жанчына. Трагікамэдыя ў 2-х дзеях.

Для дзяцей

13 нядзеля — І.Карнавухава, Л.Браўсевіч. Пунсовая кветачка. Казка ў 2-х дзеях.

Малая сцэна

12 субота — Дж.Марэл. Сьмех лангусты. Трагікамічныя сцэны.

13 нядзеля — Ю.О'Ніл. Лэдзі Нявіннасьць. Трагікамэдыя ў стылі блюз з адным антрактам.

7-8 кастрычніка 1996 года ў Менску ў памяшканьні Літаратурнага музэя Янкі Купалы (г. Менск, вул. Янкі Купалы, 4) адбудуцца прысьвечаныя 90-годзьдзю зь дня заснаваньня газэты "Наша Ніва" Міжнародныя купалаўскія чытаньні *"Янка Купала і "Наша Ніва"*

ТЕСТ

САМАЯ ПРОСТАЯ ПАМЯЦЬ

Усе, канешне, ведаюць, што ў поўнай цемры пабачыць нічога нельга. Але зрэдку можна-такі што-небудзь разгледзець.

Давайце зьмесьцім каго-небудзь у цалкам цёмны пакой і дамо час прызвычаіцца да цемры. Затым скажам нашаму паддасьледнаму, што, як толькі запаліцца сьвятло, ён павінен глядзець на ўласную руку. На паўхвіліны ўключаецца яркае сьвятло, а калі ў пакоі ізноў наступае поўная цемра, адбываецца дзіўная рэч: чалавек працягвае бачыць сваю руку, праўда, ня вельмі выразна. Паступова абрысы рукі пачнуць расплывацца, і хутка яна зусім зьнікне ў цемры.

У гэтай зьяве дзіўнага значна меней, чым здаецца на першы погляд. Сьляды тых працэсаў, што ўзьніклі пад узьдзеяньнем раздражняльніка (у дадзеным выпадку ярка асьветленай рукі) захоўваліся яшчэ нейкі час у зрокавым аналізатары. Але пасьля таго, як гэты вобраз (такія вобразы называюць пасьлядоўнымі) зьнік, можна быць перакананым, што ён зьнік назаўсёды. І калі абагульнены вобраз дому мы можам выклікаць у памяць, трэба толькі пажадаць гэтага, то пасьлядоўны вобраз ніколі не вяртаецца. Псыхолягі лічаць пасьлядоўныя вобразы самай простай формай праявы сьлядоў.

Але ёсьць яшчэ адна простая форма памяці, праўда, сустракаецца яна далёка ня ў кожнага чалавека. Адзін нямецкі псыхоляг заўважыў наступнае: некаторыя мастакі, малюючы прадмет "з натуры", ня маюць патрэбы ў тым, каб прадмет увесь час знаходзіўся ў іх перад вачыма. Яны проста некаторы час разглядваюць яго, а потым малююць па памяці. Пры гэтым малюнак атрымліваецца дакладным да самых дробных дэталяў. Псыхоляг стаў вывучаць гэтую зьяву і выявіў, што некаторыя людзі працягваюць бачыць прадмет, прычым менавіта той самы, канкрэтны прадмет, калі яго ўжо няма перад вачыма. Яны могуць бачыць яго ў любы час, як толькі гэта ім спатрэбіцца, і гэтая здольнасьць доўга захоўваецца.

У такіх выпадках кажуць, што чалавек валодае наглядньмі, ці, як кажуць навукоўцы, эйдэтычнымі вобразамі.

Далейшае вывучэньне паказала, што эйдэтычнымі вобразамі часьцей за ўсё валодаюць дзеці, а з гадамі гэтая здольнасьць зьмяншаецца. У 1921 годзе на псыхалягічным кангрэсе навукоўцам прадэманстравалі наступны экспэрымэнт: цэлай групе дзяцей напрацягу 9 хвілінаў паказвалі карціну (вы бачыце яе тут). Пасьля таго, як карціну прыбралі, яны працягвалі яе бачыць. Вось якая гутарка адбылася паміж навукоўцам і адным з тых хлопчыкаў. Але перш чым чытаць ейны запіс, вы таксама паглядзіце на карціну напрацягу 9 хвілінаў, а затым паспрабуйце самі на яго адказаць.



Пытаньне: Колькі людзей намалявана?
Адказ: Шасьцёра: чацьвёра мужчынаў і дзьве жанчыны. Адзін палівае вуліцу, трое астатніх ідуць на працу.
Пытаньне: У якім напрамку ідуць гэтыя тры мужчыны?
Адказ: Туды, углыб (паказвае рукой напрамак).
Пытаньне: Што ты бачыш у другога чалавека?
Адказ: Ён паліць доўгую піпку.
Пытаньне: Што нясе гэты чалавек на плячы?
Адказ: Вялікую кірку.
Пытаньне: Што нясе на плячы чалавек, які ідзе наперадзе?
Адказ: Рыдлёўку.
Пытаньне: А той, што ідзе ззаду?
Адказ: Падоўжаную рыдлёўку.
Пытаньне: Гэтыя людзі ідуць па ходніку ці пасярод вуліцы?
Адказ: Па ходніку.
Пытаньне: Колькі вокнаў на першым паверсе дома, побач з каторым ідуць гэтыя людзі?
Адказ: Шэсьць — пяць збоку і адно сьпераду.
Пытаньне: Чым адрозьніваецца гэтае вакно сьпераду дома ад вокнаў збоку?
Адказ: Пярэдняе вакно зачынена аканіцамі.
Пытаньне: Колькі гарлачыкаў з малаком стаіць на тачцы?
Адказ: Пяць.
Пытаньне: Бачыш шыльду над дзьвярыма, каля каторых стаіць жанчына?
Адказ: Так.
Пытаньне: Што на ёй напісана?
Адказ: Цяжка прачытаць... усе такі... Нумар, потым лічба 3 і потым 8 ці 9.
Пытаньне: Як напісаны нумар:
Адказ: Вялікая "N" і маленькая "о" зь дзьвума рысачкамі пад ім.
Пытаньне: А цяпер прачытай другую шыльду.
Адказ: Малочная крама.
Пытаньне: У якім напрамку глядзіць карова на шыльдзе?
Адказ: Улева.
Пытаньне: Адкуль дастае ваду той, хто палівае вуліцу?
Адказ: З чатырохкутнай адтуліны.


Вы, напэўна, пераканаліся, што запомніць за 9 хвілінаў так шмат дробных дэталяў карціны немагчыма. Каб здолець адказаць на ўсе пытаньні, неабходна працягваць бачыць карціну і пасьля таго, як яна прыбраная.

Канешне, наглядныя вобразы моцна адрозьніваюцца ад пасьлядоўных вобразаў перш за ўсё тым, што чалавек можа выклікаць іх адвольна. Аднак гэта таксама вынік зрокавага ўзбуджэньня.

ПРА ЦЯЖКОЕ ЖЫЦЬЦЁ І ЛЁГКУЮ СЬМЕРЦЬ

Развіцьцё мэдычнай навукі на працягу ўсяе чалавечае гісторыі зводзілася да падаўжэньня жыцьця чалавека ды выратаваньня яго ад сьмерці. І дасягнула, трэба прызнацца, немалых посьпехаў. У тэхналягічна разьвітых краінах былі пераможаныя многія хваробы, што раней непазьбежна лічыліся фатальнымі, а працягласьць жыцьця істотна ўзрасла. Але ці абавязкова чалавек стаўся шчасьлівейшым, чымся ягоныя продкі, што ледзь дацягвалі да пяцідзесяці? Падобна на тое, што ў гэтым кірунку навука загнала чалавека ў тупік. Тое, што ўчора здавалася недасягальнай марай лекараў, сёньня выглядае як найжахлівейшы кашмар. Чалавецтва аказалася маральна ды эканамічна негатовым да наступстваў сваіх уласных дасягненьняў.

Падоўжыўшы працягласьць жыцьця, чалавек павялічыў пэрыяд старасьці. Але, паводле вядомага выслоўя, страсьць — ня радасьць. Простае падаўжэньне чалавечага жыцьця пры захаваньні якаснага адставаньня спарадзіла эканамічную праблему старэньня насельніцтва, росту колькасьці пэнсіянэраў, за якімі трэба даглядаць ды плаціць пэнсіі, і зьмяншэньня працэнту працаздольнай яго часткі. У краінах Заходняе Эўропы пачынаюць гучаць трывожныя галасы пра тое, што пры захаваньні цяперашніх тэндэнцыяў, грамадзтва будзе проста ня ў стане выконваць сацыяльныя праграмы забесьпячэньня непрацаздольнай часткі сваіх жыхароў. Апроч чыста эканамічных паўсталі маральныя, псыхалягічныя ды этычныя праблемы, да якіх чалавек аказаўся асабліва непадрыхтаваным. Адна зь іх — канфлікт пакаленьняў. Прычым ня звыклы пабытовы, накшталт даўжыні валасоў ці гучнасьці музыкі, а значна больш сур'ёзны. На прыкладзе Беларусі гэта выразілася ў жаданьні (толькі жаданьні, бо вандраваньне ў часе існуе хіба ў фантастычных раманах) пераважнай большасьці пажылога электарату вярнуцца ў СССР. А на Захадзе, дзе людзі прызвычаіліся да канструктыўнага вырашэньня пытаньняў, праблему старасьці спрабуюць вырашаць практычным шляхам у залежнасьці ад культурных традыцыяў ды тэхналягічных магчымасьцяў.



ВАЯЎНІЧАЯ СТАРАСЬЦЬ

Адзін з найбольш даўніх і даступных спосабаў — плястычная апэрацыя. Хто ня памятае "вечна маладую" Эдзіту П'еху? Праўда, у былым СССР дасягненьні касмэтычнай хірургіі былі выключна для эліты. А на Захадзе гэта звыклая зьява. Але каштуе немалых грошай і патрабуе паўтарэньня. Да таго ж гэткая чыста зьнешняя зьмена аблічча нясе на сабе адбітак непаўнавартасьці ды сурагату. Нешта накшталт нарошчваньня грудзей сыліконавымі ўстаўкамі, ці фаласаў з рабрыны для транссэксуалаў.

У ЗША псыхалягічную праблему старасьці надумаліся вырашыць чыста па-амэрыканску — стварыць рэзэрвацыю для тых, каму за 60. Неяк тэлевізія БіБіСі паказала рэпартаж з аднаго невялічкага гораду ЗША, дзе жывуць выключна старыя людзі. Гэта свайго роду запаведнік, дзе старыя стварылі для сябе свой асобны замкнёны сьвет, абнесены калючым дротам. У гэтым сьвеце маладым месца няма. Дзеля таго, каб патрапіць сюды, трэба праехаць праз кантрольна-прапускны пункт, маючы спэцыяльны дазвол. Нават дзеці ня могуць наведаць тут сваіх састарэлых бацькоў, бо лічыцца, што зьяўленьне маладых у гэтым герантакратычным сьвеце можа выклікаць адмоўныя эмоцыі ягоных жыхароў. У горадзе старых усё, як і ў звычайных амэрыканскіх гарадах: крамы, цырульні, рэстарацыі, паліцыя. Праводзяцца нават свае конкурсы прыгажосьці. І што самае дзіўнае, ці брыдкае (як на чый густ) ёсьць сваё вар'етэ, дзе сямідзесяцігадовыя маладзіцы, падкідаючы маршчыністыя ногі, задзіраюць спадніцы, спакушаючы дзевяностагадовых гледачоў.

НАЎЗДАГОН МАФУСАІЛУ

Натуральна, што большасьцю людзей такія гарады-запаведнікі не разглядаюцца як вырашэньне праблемы старасьці, а хутчэй як уцёкі ад рэальнасьці. Таму некалькі амэрыканскіх мільярдэраў (якія, мусіць, намерыліся абвергнуць прымаўку, што здароўе ня купіш у краме) вырашылі правесьці атаку на старасьць з дапамогай мэдычнай навукі. На іх даляры распачаліся пошукі гена чалавека, што адказвае за ініцыяцыю старэньня. Такі ген быў знойдзены летась.

Паколькі гэтыя дасьледаваньні праводзіліся выключна на прыватны заказ групы мільярдэраў, то вынікі асабліва не афішаваліся. Брытанскія журналісты здолелі толькі ананімна ўзяць інтэрвію ў аднаго з членаў гэтай групы. Той, седзячы ў сваім шыкоўным лімузыне, паведаміў, што гэтае рэвалюцыйнае адкрыцьцё абяцае дазволіць чалавеку жыць не старэючы да трохсот гадоў. На пытаньне журналіста пра дэмаграфічныя наступствы такога адкрыцьця ён паведаміў, што па-першае, генэтычны эліксыр жыцьця атрымаюць ня ўсе, а толькі тыя нямногія, хто заплаціў за дасьледаваньні, ці тыя, каму дазволяць замоўцы. Але на выпадак, калі працэс падаўжэньня жыцьця набудзе больш шырокія памеры, існуе іншы генэтычны варыянт вырашэньня праблемы. Мільярдэр паведаміў, што такі варыянт быў пралічаны ад самага пачатку фінансаваньня праекту, і паралельна з генам старэньня быў знойдзены спосаб "выключэньня-ўключэньня" гена, што адказвае за размнажэньне чалавека. Мільярдэр абвесьціў перад камэрай БіБіСі, што дзеля таго, каб мець дзяцей, маладым давядзецца пісаць адпаведнае прашэньне, якое будзе разглядацца трохсотгадовымі "гаспадарамі жыцьця", і такі прывілей атрымаюць толькі тыя, хто падпадзе пад устаноўленыя састарэлай элітай стандарты.

Усё гэта гучыць як нейкая фантастычная оруэлаўшчына, але, чытач, дай веры, аўтар гэтага артыкулу бачыў гэты рэпартатаж на ўласныя вочы ў сур'ёзнай передачы БіБіСі пра дасягненьні навукі й тэхнікі.

ЖЫВЫЯ ТРУПЫ

У той час, як адныя шукаюць шляхоў да падаўжэньня жыцьця, іншыя змагаюцца за яго спыненьне. Мэдычныя дасягненьні зрабілі чалавека іх закладнікам. Шматлікія прыборы штучнага падтрыманьня жыцьця, здольныя забясьпечваць функцыянаваньне арганізму нават пры адключэньні мозгу, спарадзілі праблему "жывых трупаў".

Раней спаралiжаваны чалавек, ня здольны самастойна дыхаць ці глытаць ежу, проста паміраў. А цяпер, падключаны да мудрагелістых сыстэмаў падтрыманьня жыцьця, ён пакутуе сам і мучае сваіх родных, марнуючы да таго ж сотні тысячаў даляраў на мэдпэрсанал ды абсталяваньне. Асабліва пакутуюць тыя, хто, будучы цалакам спаралiжаванымі, захоўваюць здольнасьць думаць. Яны мо й папрасілі б, каб іх адключылі ад прыбораў, але фізычна ня могуць гэтага зрабіць, бо нават вочы расплюшчыць ня могуць.

Заканаўдаўствы заходніх краінаў, дзе гэта адбываецца, не гатовыя да выра-

Ганна Матусэвіч

ДЗЁНЬНІК БЕЗ КАНЦА

20.09. Сатана з высокай гары паказваў Хрысту ўсю прыгажосьць зямнога сьвету, але Ён не спакусіўся на зямное царства. І майму мужу Бог сёньня паслаў дзівосны сон. Быццам трапіў ён на нейкі сэанс, дзе вельмі далікатная жанчына паказвала без аніякай тэхнікі прыгожыя карціны на сьцяне. Пасьля прапанавала паказаць зоры, так як гэта робяць у плянэтарыі. Муж абыякава згадзіўся зь ейнай прапановай. А іншыя гледачы, выйшаўшы з залі, пыталіся адзін у аднаго, ці ня можна тут замовіць сэксуальных партнэраў. Вось яна, душа народа нашага! Можна і перад сьветланоснай карцінай стаяць у поўнай цемры.

Неяк у "Крыніцы" чытала Георгія Коласа, дзе ён, на маю думку, зацямняе небасхіл, кажучы, што не было ў нас апосталаў. Бо тыя, што былі, ня вытрымалі зямнога чыстца. Але ён бярэ занадта вузенькі пэрыяд: рэпрэсіўныя 30-ыя гады нашага стагодзьдзя. А калі ўзяць шырэй? Зірнуць на ўвесь гэты сьвет, падгледзець у шчыліну і той сьвет? Жыдоўскі народ не прыняў ачышчэньня новага Вучэньня, што прыносіў ім Хрыстос. Ён укрыжаваў Хрыста, і таму так пакутліва й доўга ішоў да стварэньня сваёй дзяржавы. Будда таксама прыносіў народам Індыі свабоду, зьнішчэньне каставай сыстэмы, але Індыя, выгнаўшы будызм — выбрала рабства. У нас былі свае сьветлыя апосталы ў эпоху Рэнэсансу. Гэта й Францішак Скарына, і Леў Сапега, і Сымон Будны... І наш народ, як бы там ні ставіўся да іх, але ж ня спальваў уласнымі рукамі на вогнішчы, не ўкрыжоўваў, не забіваў... Былі забітыя высокія думкі, дух гэтых выдатных людзей, а гэта яшчэ большае злачынства, чым забойства цела. І гэта зрабіў Рым.

Наш народ не забіваў, наш народ проста не дарос да народа, ён яшчэ дзіця. Дык не спэкулюйце, дарослыя дзядзькі, на дзецях!

26.09. На мяне сыходзіць нейкае дзіўнае сьветлае цяпло, спакой, ласка. Наўрад ці былі ў мяне такія адчуваньні ў суворым маленстве... Гэта як быццам бы нехта дужы й добры бярэ на сябе твой цяжкі клопат. Можа хіба было нешта падобнае, калі я хадзіла сваім першынцам...

Я нясу свой акруглелы жывот па гурбах сьнегу. Насычана-фіялетавы, звонкі вечар. (Можа мы аднолькава з Максімам чулі яго звонкім?) Незнаёмае шырокае поле, доўгая, але ня цяжкая дарога. Я нясу жыцьцё па амярцьвелай зямлі, што ляжыць у змроку. На мяне глядзяць зоры. Я ступаю ў глыбокія мужавы сьляды. Мы разам ідзем за тымі нешматлікімі людзьмі, якія ўжо хадзілі ў гэтым кірунку. Сьцежка яшчэ ня вытаптаная, дый ці вытапчацца яна наогул, бо шалёная завіруха ня дрэмле...

...А я драмлю на вельмі цёплай печы, лежачы на сьпіне, і зусім не клапачуся пра жыцьцё, што таксама сьпіць ува мне. За мяне гэта робяць іншыя. Мяне абдымае дзіўнае сьветлае цяпло, спакой, ласка... Вось як і цяпер... Хто гэта?

29-30.09. Ізноў сьніцца майму мужу сон, а я, што тая цыганка, разгадваю яго. Бачыў свайго бацьку-нябожчыка — майго сьвёкра, якога я ніколі не страчала (ён памёр, калі майму будучаму мужу было 15 гадоў). Бацька жаліўся сыну, што кепска сябе пачувае, камень на сэрцы ў яго ляжыць. Муж выказвае здагадку, што трэба даць грошай бацюшку, каб той памаліўся за грэшную душу, бо сам, маўляў, маліцца ня ўмее.

А я думаю, гэта мая віна, што сьвёкру на тым сьвеце блага. Раней кожнае лета мы ўсёй сям'ёй езьдзілі на Мёршчыну даглядаць ягоную магілку. А сёлета не паехалі. Не сабраліся. Старэюць мае бацькі, трэба ім дапамагаць, а на Мёршчыне ў нас сёлета памянела сваякоў. І, паехаўшы, трэба думаць, дзе прыпыніцца. Але гэта ўсё пустыя адгаворкі, бо Мёршчыну я люблю, мусіць, болей за родную Койданаўшчыну, і ня можна здраджваць той зямлі, дзе адпачываеш душой.

Узімку памерлі там дзядзька Коля і баба Дарота. Дзядзьку было 60, бабцы каля 90. Дзядзька жыў бабылём на хутары ў лесе. Спачатку са старэнькай маткай у хаце, дзе не было нават электрычнасьці. Пасьля ейнай сьмерці дзядзька перабраўся на больш "цывілізаваны хутар", які стаяў асобкам ад вёскі, на ўзьлеску (лічы ў лесе) пры самай Дзьвіне. Дарэчы, дзядзька Коля Панізьнік, родны брат маёй сьвякрові, даводзіўся далёкім родзічам (пень у лесе гарэў...) нашаму паэту Сяргею Панізьніку. Дзядзька казаў, што Панізьнікі вяліся ў Бабышках, і што дзед Уладзімер, ягоны бацька, хрысьціў Сяргея.

У той хаце была электрычнасьць, але дзядзька так і не прыдбаў сабе газавай пліты. Зрэшты, яму ні першае, ні другое не патрэбна было. Калі мы спыняліся ў яго на начлег, ён на радасьць і нам, і дзецям раскладзе агонь ды наварыць на крынічнай вадзе бульбы ці макаронаў. Хіба можна гэткую першабытную страву параўнаць хоць з чым-небудзь на сьвеце? Дзеля аднаго абеду — сем міль еду, а тут жа — клад невычэрпны, скарб закапаны! І пра хату, і пра дзядзьку можна расказваць бясконца. Хата гістарычная: у ёй сядзяць кулі з часоў польска-бальшавіцкай вайны, яе падмывала веснавой паводкай Дзьвіна. Яна стаіць на памежжы і ведала ўплыў розных культураў: польскай, расейскай, латыскай, беларускай... На тое месца болей (чым, скажам, на Койданаўшчыну) уплывае старажытная Вільня, як няісная ўжо плянэта, сьвятло якой яшчэ сьвеціць некаму... Хата па-казённаму адносіцца да вёскі Чурылава, дзе ўжо люта згвалчана цнатлівая культура маёй любаснай зямелькі. Але гаспадар сьцярог рэшткі культуры суседняга Лямполя, дзе захавалася царква, у якой дагэтуль стаяць цагляныя калёны ў гонар Канстытуцыі Рэчы Паспалітай 3 мая 1971 году. Ляжыць перада мной цяперака шумёла, што знайшоў некалі дзядзька ды падараваў нам.

шэньня такіх праблемаў. Паводле існуючых правілаў адключэньне прыбораў штучнага падтрыманьня жыцьця можа рабіцца толькі пасьля канстатацыі гібелі мозгу на падставе паказаньняў энцэфалёграфа. Галяндзкай жанчыне, цяпер удаве, Марыі Леўрс некалькі гадоў давялося хадзіць па судах, каб дамагчыся ращэньня адключыць апарат для свайго спаралізаванага мужа. Прычым станоўчае рашэньне ёй удалося вабіць толькі дзякуючы таму, што ў яе былі запісы мужа, зробленыя ім да паралюша, дзе муж, прадчуваючы наступствы хваробы, выказваў сваё пажаданьне такога кроку. Вось чаму цяпер многія хворыя (а часам здаровыя) загадзя пішуць натарыяльна заверанья запаветы, дзе дакладна агаворваюць сваю згоду на адключэньне прыбораў у выпадку поўнай нядзеяздольнасьці. Праўда, многія лекары выступаюць супраць такой практыкі, якая пакрысе пачынае прабіваць сабе дарогу. Яны сьцьвярджаюць, што пакуль энцэфалёграф рэгіструе наяўнасьць разумовых працэсаў, такі крок будзе наўмысным забойствам. Да таго ж існуюць засьцярогі, што могуць пачацца масавыя злоўжываньні, калі на жаданьне сваякоў будуць адключацца пацыенты рэанімацыі, якіх можна было б вярнуць да актыўнага жыцьця.

НАРОДЖАНЫ, КАБ ПАМЕРЦІ

У гэтых адносінах асабліва трагічная сытуацыя ў выпадку зь дзецьмі, што народжаныя з сур'ёзнымі захворваньнямі. У ангельскай сям'і Крыданаў нарадзіўся сын Томас з амаль атрафаваным мозгам. Ён ад самога пачатку быў спаралізаваны, ня бачыў, ня чуў, ня мог глытаць ежу. Але памерці яму не далі і пачалі штучна карміць праз праведзеную непасрэдна ў страўнік трубку. Бацькі лічаць, што няшчаснае дзіця мусіць памерці, а лекары, — што Томас мае права на жыцьцё. Маўляў, Томас мае некаторае ўспрыняцьце зьнешняга сьвету (напрыклад, рэагуе на боль).

Трохгадовы хлопчык аказаўся ў цэнтры маральнай ды юрыдычнай бітвы. Бацькі кажуць, што ня трэба мучыць дзіця, штучна падтрымліваючы ў ім жыцьцё. У працівагу ім, доктар Флор Фішэр з Брытанскай Мэдычнай Асацыяцыі сьцьвярджае, што, калі Томасу дадуць памерці, будзе створаны прэцэдэнт, і мэдыцына зробіцца інструмэнтам пазбаўленьня грамадзтва ад тых, хто ня мае ніякай каштоўнасьці.

Калі Томас толькі нарадзіўся, ніхто ня думаў, што ён працягне болей за некалькі тыдняў. Насуперак волі бацькоў, лекары вырашылі, што трэба рабіць штучнае кармленьне. Доктар Роджэр Масэй, які апякуецца Томасам, лічыць, што права на ежу ёсьць неад'емным правам чалавека. Складваецца парадаксальная сытуацыя. З аднаго боку, лекары разумеюць, што хлопчык пакутуе, нават не ўсьведамляючы гэтага, і што штучнае падтрыманьне ў ім жыцьця бесперспэктыўнае. А з другога боку, яны цьвердзяць пра правы чалавека.

ЛЁГКАЯ СЬМЕРЦЬ

Калі ідуць такія дзбаты наконт спыненьня штучнага падтрыманьня жыцьця ў людзей накшталт Томаса, то што казаць пра нармальных людзей, пра тых, хто вырашыў добраахвотна расстацца з жыцьцём. Папросту, зьдзейсьніць самагубства.

Права на самагубства пачынае набываць усё больш і больш прыхільнікаў. Яны лічаць, што калі жанчына мае права на аборт — забойства ненароджанага дзіцяці; то чаму дарослы чалавек не мае права распараджацца ўласным жыцьцём? Асабліва гэта тычыцца тых, хто хварэе на невылечныя хваробы накшталт раку. Вядома, што людзі, якія паступова паміраюць ад раку, церпяць жахлівыя болі, адзіны ратунак ад якіх — ін'екцыі опію. Многія зь іх мараць толькі пра сьмерць. І яны б з радасьцю скончылі самагубствам, але баяцца або ня ведаюць, як гэта зрабіць найбольш эфэктыўна і бяз болю. Вось каб быў кваліфікаваны спэцыяліст-лекар...

Піянэрам у дапамозе самгубцам стаў доктар Геваркян з ЗША. Ён адкрыў кансультацыйны цэнтар для самагубцаў і нават сканструяваў дзеля гэтага адмысловы апарат. Гэта нешта накшталт кропельніцы, дзе замест лекаў запраўляецца атрута. Доктар Геваркян падключае апарат да пацыента, які сам уключае паступленьне атруты. Такі від паслугаў атрымаў назву эўтаназія, ці лёгкая сьмерць. Плаці грошы і, як кажуць амэрыканцы, бай-бай! Тая ж самая мэдычная навука, што, здавалася, здолела падмануць самую сьмерць, цяпер паскорвае яе прыход. Жыцьцё аказалася занадта цяжкім выпрабаваньнем, а лёгкая сьмерць — адзіна даступнымі лекамі.

Уладзімер Бараніч

Напісана на ёй: VICTORIA". Які пан хварсіў ёю, на якой конскай шыі яна зьвінела?

Чалавек жыве на зямлі столькі, колькі хоча жыць сам. Бог даў яму доўгае жыцьцё ў трох выпадках: калі ён хоча закончыць нейкую важную працу, калі дапамагае іншым і калі сьведчыць аб мінуўшчыне. А дзядзька Коля быў зацятым вартаўнікам старой культуры гэтай зямлі. Памятаю, як мы, яшчэ за савецкім часам, прыязджалі да яго з Латвіі, і ён даваў мне на імгненьне патрымаць старасьвецкую Біблію і зараз жа сутаргава выхопліваў яе з маіх рук. Стаіць у вушшу інтанацыя ягонага дрыжачага голасу, калі ён дакараў свайго пляменьніка: "А да каго б ты прысхаў?!"

Старая праваслаўная культура з Богам у царкве памерла, і дзядзьку Колю не было чым жыць таксама. Бог павінен жыць у душы. А вось бабка Дарота да апошніх сваіх дзён дапамагала іншым, злавалася, калі ў яе забіралі работу. Яна жыла пры сваіх дзецях, Фені ды Юрку, якія ня зьвілі собскага гнязда. Цікава, што бабка клікала Юрку — Жоржыкам, і мне ў зьвязку з гэтым успомніліся думкі Яна Пятроўскага наконт імёнаў: "Усё залежыць ад таго, у якіх адносінах знаходзяцца людзі, бо ад гэтага імёны прыймаюць іншы гук і каляр. Маці маленькага сыночка можа назваць Янкам, Яначкам... Закаханая дзяўчына можа назваць свайго хлопца Янкам, і жонка — мужа..." Далей ён піша пра Крывію, Літву, Беларусь. І пытаецца: "Што можна зрабіць пры гэткім немалым выбары ў назовах?" Здаецца, я адкажу: расьці, расьці і вырасьці да Ліцьвінаў. А расьці можна толькі на глебе Абсалютнай Веры. Тады, усё, што трэба рабіць, падкажа Бог.

Спачатку яны таксама раскашавалі ў лясным хутары. Боская мясьціна! Памятаю, сказала цётцы Фені (падчас, калі яны ўжо перабраліся ў Паташню), што надта шкадую старой хаты — яна заплакала. У Паташні яны маюць і тэлефон, і валу ў хаце, а душа рвецца на волю, уцякае ад гэтай сытасьці. Мы прывозілі ўсялякіх прысмакаў з гораду, але бабка Дарота казала, што ня есьць крамнага (зрэшты й не насіла). Бабка навучыла Віталіка вязаць кручком, пякла ў печы маім дзецям такія смачныя сухарыкі, якія я нізавошта не напяку на сваёй электрычнай пліце! Бабка Дарота першая адкрыла мне, што "мать-и-мачеха" завецца "мамашнікам". Яна падазравала ўва мне "маскальку", калі я гаварыла зь ёю на скалечанай наркамаўцы. Гэтыя людзі — самыя шчырыя вернікі. Усё зробленае іхнымі рукамі, усё прапушчана праз іхныя сэрцы. Успамінаю, як прыязджала да іх зь Менску нейкая ілэістка, што дужа рупілася аб рэстаўрацыі праваслаўнай царквы. Яны, непісьменныя, яе адразу распазналі, чаго я, грамацейка, зрабіць ня ўмела. Бабка Дарота, лежачы ўжо на Боскай пасьцелі, трызьніла, што гэнай — "варотаў не адчыняць".

Мёршчына не разбэшчаная так а-ля цывізацыяй, як Койданаўшчына. Там жывуць простыя людзі, якіх я так люблю. А я не праўдала іх гэтым летам. Вось і ляжыць камень на сэрцы ў майго сьвёкра.

Кніга — поштай



На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць кнігі:

1. **Адам Глёбус. Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы.** – Менск: Сучасная літаратура, 1995. – 310 с. 39.000 БРБ
2. **Адам Глёбус. Скрыжаваньне.** – Менск: БАДППР – "Ковчег", 1993. – 46 с. 7.000 БРБ
3. **Юліяна Вітан-Дубейкаўская. Мае ўспаміны.** – Вільня, 1994. – 192 с. 24.000 БРБ
4. **Баляслаў Лесьмян. Пан Бліщчынскі** / Пераклад з польскай. – Вільня-Менск: "Наша Ніва" – "Мастацкая Літаратура", 1994. – 93 с. 10.000 БРБ
5. **Вітаўт Кіпель. Беларусы ў ЗША.** – Менск, 1993. – 352 с. 25.000 БРБ
6. **Брэтон Ф., Пру С. Выбух камунікацыі.** – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1995. – 336 с. 24.000 БРБ
7. **Говард Майкал. Сучасная культурная антрапалёгія.** – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1996. – 486 с. 35.000 БРБ
8. **Лоўзі Дж. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі.** – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1995. – 328 с. 24.000 БРБ
9. **Энтані Сьміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі.** – Менск: БФС – "Эўрафорум", 1995. – 272 с. 20.000 БРБ
10. **Джын Эйчысан. Гаваркія істоты; Уводзіны ў псыхалінгвістыку.** – Менск: БФС – "Кліч", 1995. – 312 с. 20.000 БРБ
11. **Браян М. Фэйган. Уводзіны ў археалёгію.** – Менск: БФС, 1996. – 272 с. 24.000 БРБ
12. **Беларускі рок-н-рол: Тэксты ("Бонда", "Крама", "Мроя", "Новае Неба", "Уліс").** – Менск: "Ковчег", 1994. – 64 с. 7.000 БРБ
13. **Беларускі вайсковы строй і зброя XII-XVIII ст.** Камплект каляровых паштовак (12 асобнікаў). – Менск: НВФ "Vaukalaka", 1996. 25.000 БРБ
14. **Беларускі гістарычны агляд.** 1996, т. 3, сшытак 1. 35.000 БРБ
15. **Ш.Дэбаш, Ж.-М.Пант'е. Уводзіны ў палітыку.** – Менск: БФС – "Эўрафорум", 1996. – 624 с. 40 000 БРБ
16. **М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі (1765-1794).** – Менск, 1994. – 168 с., каляровыя іл. 20 000 БРБ
17. **Z.Fedecki. Цёплыя вечары... ды халодныя ранкі, czyli co śpiewano w Feliksowie.** – Warszawa, 1992. – 160 с. 20 000 БРБ
18. **Юрг Штайнэр. Эўрапейскія дэмакраты.** — Менск: БФС — "Лекцыя", 1996. — 343 с. 45.000 БРБ.
19. **Джон Бэрдшоў. Эканоміка. Ч. 1: Мікраэканоміка / Дапаможнік для студэнтаў.** — Менск: БФС — "Тэхналёгія", 1996. — 560 с. 50.000 БРБ.
20. **Уэстан Ла Бар. Асабістасьць з псыхааналітычнага пункту гледжаньня.** — Менск: "Тэхналёгія", 1995. — 47 с. 15.000 БРБ.
21. **Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры). №1, 1996.** 35 000 БРБ.

Зьвяртайцеся на адрас: Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89. У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз тэл. 239-78-49.

НОВЫЯ КНІГІ І ПЭРЫЁДЫКІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Адамовіч Славамір. Каханьне пад акупацыяй: Вершы. — Менск, 1996. 47 с.

Ванкевич Е. Экономические проблемы становления рынка труда. — Менск: ООО "Жисанта", 1996. — 68 с. 3000 ас. ISBN 985-6080-14-2

Гелер М. "Калі забуду цябе, Ерусалім...": Аповед-падарожжа: Для малодшага школьнага ўзросту: Пераклад з расейскай / Мастак К.Ракіцкі. — Менск: Юнацтва, 1996. — 126 с.: іл. 3000 ас. ISBN 985-05-0194-4

Гомончук М., Остапенко В. Радиация: факты без эмоций. —Менск: Изд. Гомончук, 1996. — 96 с. 2000 ас. ISBN 985-6330-01-7

Дворников С. Звёзды над бакеном: Стихотворения. — Менск: Мастацкая літаратура, 1996. — 70 с. 600 ас. ISBN 985-02-0327-7

Контракты с пенсионерами / В.Кривой, И.Чистякова. — Менск: Белорусский кадровый центр "Профессионал", 1996. — 32 с. 3500 ас. ISBN 985-6004-09-8

Ксэракс беларускі №6. — Полацак: Таварыства Вольных Літаратараў, 1996. 48 с.

Можно ли победить радиацию. Рекомендации специалистов / О.Жуковская, С.Ковалёв, И.Ромвич и др. — Менск: Беларусь, 1996. — 32 с. 5000 ас. ISBN 985-01-0138-5

Нестеренко В. Радиационный мониторинг продуктов питания у населения в регионах Беларуси, пострадавших в результате катастрофы на Чернобыльской АЭС. Серия: "Чернобыльская катастрофа": Информационный бюллетень №1. — Менск: Право и экономика, 1996. — 29 с. 150 ас. ISBN 985-6194-37-7

Палесьсе. Літаратурна-гістарычны і грамадзка-культурны часопіс.— Гомель, 1996. №1, чэрвень.

Сом Л. Адзінокая зорка: Вершы і песьні / Прадмова В.Аксак. —Менск: Мастацкая літаратура, 1996. — 86 с. — (Першая кніга паэта). 700 ас. ISBN 985-02-0276-9

Спадчына. — Менск, 1996. №4. 288 с. 4700 ас. ISBN 0236-1019

Старычонак В. Беларуская літаратура. Дапам. для абітурыентаў. — 4-е выд., дапрац. — Менск: Вышэйшая школа, 1996. — 350 с. 30 000 ас. ISBN 985-06-0200-1

Строк Л. Апорныя канспэкты па беларускай мове: 5-9 кл. —2-е выд. — Менск: Унівэрсытэцкае, 1996. — 48 с. 10 000 ас. ISBN 985-09-0171-3

Хвалей Я. Прыстань віцінаў: Кніга паэзіі. — Менск: Мастацкая літаратура, 1996 — 127 с.: іл. 1000 ас. ISBN 985-02-0297-1

Чернобыль: шанс выжить / А.Лоцко, И.Ролевич, В.Тернов. — Менск: Полымя, 1996. — 181 с.: іл. 5000 ас. ISBN 985-07-0012-2

НОВЫ БЕЛАРУСКІ КНІЖНЫ ПРАЕКТ

Беларускі Гуманітарны Фонд "Наша Ніва" наладзіў распаўсюджаньне найноўшых беларускіх выданьняў у галіне гуманістыкі, а таксама мастацкае літаратуры. Наша мэта — зрабіць новую беларускую кнігу жывым фактарам сучаснае культуры.

Сыстэма "Новага беларускага кніжнага праекту" дзейнічае ў гарадах:

БЕРАСЬЦЕ

Кнігі Браяна М. Фэйгана "Ўводзіны ў археалёгію", Энтані Сьміта "Нацыяналізм у XX ст.", Ш.Дэбаша й Ж.-М.Пант'е "Ўводзіны ў палітыку" можна набыць у кнігарнях "СЬВІТАНАК" (бульвар Касманаўтаў, 120) і "АСЬВЕТА" (вул. Маскоўская, 57). У "Сьвітанку" таксама прадаецца камплект каляровых паштовак "Беларускі вайсковы строй і зброя XII-XVIII ст."

ГОМЕЛЬ

У памяшканьні Гомельскай абласной унівэрсальнай бібліятэкі (пл. Перамогі, 2) пры Аддзеле інфармацыйных тэхналёгіяў (тэл. 55-71-97) адкрыты кніжны аддзел. Гэта адзіная кропка ў 500-тысячным горадзе, дзе можна пабачыць такі асартымэнт сучасных беларускіх кніг — мастацкую літаратуру, дасьледаваньні ў галіне гуманістыкі, найноўшыя пераклады. Апроч кніжак тут таксама можна прыдбаць самыя апошнія запісы беларускае музыкі.

ГОРАДНЯ

Продаж кніжнай прадукцыі адбываецца ў шапіку "ВАСІЛЁК" (насупраць Унівэрсытэту).

МАЛАДЭЧНА

Кнігі можна набыць у шапіку ТБМ (на чыгуначным вакзале). Па даведкі можна зьвяртацца праз тэл. 6-71-70 да Алеся.

МЕНСК

Кніга Браяна М. Фэйгана "Ўводзіны ў археалёгію" прадаецца ў кнігарнях "Сьветач", "Акадэмкніга", "Кнігарня пісьменьніка", "Паліткніга". Кнігі Адама Глёбуса "Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы" й "Дамавікамэрон" прадаюцца ў крамах "Сьветач" і "Кнігарня пісьменьніка", у шапіку ў фае Нацыянальнай бібліятэкі.

СЬВЕТЛАГОРСК

Кнігі можна набыць у філіі БГАКЦ, Зялёная вул., дом 10, паверх 2. Тэл. (8-02342) 2-71-77.



На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт — 25.000 БРБ):

1. **НОВАЕ НЕБА.** Сон у трамваі.
2. **НОВАЕ НЕБА.** Go home (1995).
3. **НОВАЕ НЕБА.** Дзеці чорнага гораду (1991).
4. **КРАМА.** Камэндант (1995).
5. **КРАМА.** Хворы на Rock-n-Roll.
6. **КРАМА.** Гэй там налівай! (1994).
7. **N.R.M.** LaLaLaLa (1995).
8. **ULIS.** Life (1996).
9. **УЛІС.** Чужаніца (1991).
10. **УЛІС.** Краіна доўгай белай хмары (1990).
11. **БОНДА.** Найлепшыя песьні.
12. **МЯСЦОВЫ ЧАС.** Наша ўскраіна (1991).
13. **ПАЛАЦ.** Палац (1996).
14. **Песьні беларускіх бардаў** (1992).
15. **РЭНЭСАНС** (беларускі джаз).
16. **БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ.**
17. **БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА** (1-3)
18. **БЕЛАРУСКАЯ ГІТАРНАЯ МУЗЫКА.**
19. **ЗАЛАТЫ ФОНД БЕЛАРУСКАГА РОК-Н-РОЛУ** (1-3).

Т.1: Бонда. Уліс. Мроя. Рэй. Мясцовы Час. Блізьняты.
Т.2: Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае Неба. Мясцовы Час. Тутэйшыя хлопцы.
Т.3: Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & "Доктор Моро". Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо.
Т.4: Палац. Уліс. Крама. Новае Неба. Мроя.
Т.5: Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Red Dynamite. Флэт.

20. **МРОЯ.** Найлепшыя песьні з праграмаў 1987-90 г.
21. **УЛІС.** Блуканьне (1996).
22. **ВІКТАР ШАЛКЕВІЧ.** Смутны беларускі блюз (1996).
23. **КАМЭЛОТ.** У краіне талераў (1995).
24. **ZINDAN** (1994).
25. **КРАМА.** The Best (1996).

Зьвяртайцеся на адрас: 220094 Менск, а/с 89, Андрыеўскаму Андрэю Паўлавічу. У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз тэл. 239-78-49.

Рарытэт

Паведамленьне для аматараў «Нашай Нівы»

У рэдакцыі "Нашай Нівы" вы можаце замовіць рарытэтныя нумары з моманту аднаўленьня газэты ў Вільні: №1-4 за 1991 г., №6-8 за 1992 г., №10, 12-18 за 1993 г., №1, 2, 6, 8-9, 12 за 1994 г., №5-8 за 1995 г.

Ахвотныя могуць замовіць сабе ксэракопію любога нумару.

Зьвяртайцеся на адрэсу:

Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89.

Паведамленьне для замоўцаў Літоўскае Мэтрыкі.

У Менск завезеныя шосты й восьмы тамы Мэтрыкі. Просьба да тых, хто не пакідаў пры замове нумароў сваіх тэлефонаў, зьвярнуцца да Андрэя Андрыеўскага праз тэлефон **239-78-49.**



Міхась Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі (1765-1794) / Каляровыя ілюстрацыі А.Прыбылоў. Графічныя ілюстрацыі М.Лазоўскі. — Менск: Выдавец Зьміцер Салошкін, 1994.

Кніга прысьвечаная 200-м угодкам паўстаньня Касьцюшкі. Зьмешчаныя каляровыя ілюстрацыі абмундзіраваньня войска ВКЛ, графічныя рэканструкцыі зброі. Распачынаецца кніга з грунтоўнага нарысу пра вайсковую гісторыю Вялікага Княства другой паловы XVIII ст. Кніга рэцэнзавалася ў «Нашай Ніве» (№ 7, 1994).

Ці здольныя Вы весьці сваю справу?



Абярыце ў кожным зь сямі пунктаў па аднаму з вызначэньняў вашых якасьцяў, якое больш за ўсё вам падыходзіць. Пастаўце сабе балы: а/4; б/3; в/2; г/1.

1. Ініцыятыва

а) шукае дадатковыя заданьні
б) вынаходлівы, кемлівы пры выкананьні заданьня;
в) выконвае неабходны аб'ём працы без указаньняў кіраўніцтва;
г) безініцыятыўны, чакае указаньняў.

2. Стаўленьне да іншых

а) пазытыўны пачатак, сяброўскае стаўленьне да людзей;
б) прыемны ў стасунках, ветлівы;
в) часам зь ім цяжка працаваць;
г) сварлівы і некамунікабэльны

3. Лідарства

а) моцны, дае упэўненасьць і давер;
б) умела аддае эфэктыўныя загады;
в) які вядзе
г) якога вядуць

4. Адказнасьць

а) выяўляе адказнасьць пры выкананьні даручэньняў
б) пагаджаецца з даручэньнямі (хоць і з пратэстам)
в) неахвотна пагаджаецца з даручэньнямі
г) ухіляецца ад любых даручэньняў

5. Арганізацыйныя здольнасьці

а) валодае здольнасьцю пераконваць, уменьнем будаваць факты ў лягічным шэрагу;
б) здольны арганізатар;
в) сярэднія арганізатарскія здольнасьці;
г) кепскі арганізатар.

6. Рашучасьць

а) порсткі і дакладны;
б) пэўны і асьцярожны, абачлівы;
в) порсткі, але часта робіць памылкі;
г) баязьліўца, які вагаецца.

7. Цягавітасьць

а) мэтанакіраваны, не губляецца перад складанасьцямі;
б) стала прыкладае намаганьні;
в) сярэдні ўзровень цягавітасьці і рашучасьці;
г) амаль ніякай цягавітасьці.

Падсумаваўшы балы, адзнака вашых патэнцыйных здольнасьцяў валодаць і кіраваць уласнай справай такая:
выдатная (25-28),
вельмі добрая (21-24),
добрая (17-20),
сярэдняя (13-16),
кепская (12 і меней).



Новая рубрыка

АДКАЗВАЕМ НА ПЫТАНЬНІ ЧЫТАЧА

Крычэўскі Антон, студэнт.Менск

Скажыце калі ласка якія перавагі кампутараў "лэп-топ" перад вялікімі кампутарамі?

Паважаны Антон, лэп-топы не горш параўнальных зь імі вялікіх кампутараў. Аднак карыстаньне прыладкаванымі вадкакрысталічнымі дысплэямі і паменшанай клявіятурай патрабуе досьведу. Ідэальнымі гэтыя кампутары могуць быць у дарозе, але ўлічвайце, што зарадкі акумулятара хапае максымум на тры гадзіны працы. Агульнае найлепшае ўражаньне пакідае мадэль Toshiba (3550 нямецкіх марак), аднак і мадэлі Compag, Olivetti, Sanyo, TA і Apple на думку экспэртаў лічацца добрымі. З тэхнічнага пункту гледжаньня цалкам прымальная і самая танная мадэль Highscreen 386 SX 25 (2000 нямецкіх марак).

Малышава Вольга, настаўніца. Бараўляны

Што павінна рабіць ЖЭА, каб нашыя дамы былі ў добрым стане?

Паважаная Вольга, у адпаведнасьці з законам, наймадаўца (ЖЭА) абавязаны сваечасова праводзіць рамонт жыльлёвых дамоў, забясьпечваць бесьперабойную працу інжынэрнага абсталяваньня дамоў і жыльлёвых памяшканьняў, належны стан пад'ездаў, іншых месцаў агульнага карыстаньня дамоў і перад імі. Перш за ўсё ЖЭА павінна сыстэматычна аглядаць жылыя дамы і на падставе гэтых аглядаў выяўляць аб'ёмы работ па бягучым рамонце, а таксама знаходзіць непаладкі і пашкоджаньні, выпраўленьне якіх патрабуе капітальнага рамонту, інакш кажучы, так сачыць за нашымі дамамі, каб ня здарылася якой небудзь аварыі.

Рабчонак Мікалай, супрацоўнік ДАІ. Магілёў.

У газэце "Известия" неяк прачытаў, што ў ЗША навукоўцамі было даведзена, што выкарыстаньне афіцэрамі паліцыі ручнымі радарнымі ўстаноўкамі можа павялічыць рызыку захворваньня ракам. Што Вы можаце сказаць пра гэта?

Паважаны Мікалай, пераносныя радарныя ўстаноўкі (якія выкарыстоўваюцца для вылічэньня кіроўцаў, якія перавысілі хуткасьць) даюць мікрахвалёвую радыяцыю, падобную да той, якую даюць мікрахвалёвыя печы. У Беларусі няма дакладных навуковых доказаў, што ўзровень радыяцыі, які выдаюць радарныя ўстаноўкі, можа быць шкодным. Аднак "Інфарматар" дае Вам наступныя парады:

-заўсёды трымайце ўключаную ўстаноўку далей ад свайго цела і цела напарніка, устанаўлівайце радарную ўстаноўку так, каб балянсір ня быў ні на каго скіраваным ў патрульнай машыне.

-калі гэта магчыма, паварочвайце ў бок ручную ўстаноўку, калі яе не выкарыстоўваеце.

-калі ваша ўстаноўка мае надзейную апору, заўсёды прымяняйце яе, калі не замерваеце хуткасьць транспартнага сродку.

-ніколі не разьмяшчайце ўстаноўку супраць цела, калі яна ўключаная.

-імкніцеся пазьбягаць скіраваньня ўстаноўкі на мэталёвыя паверхні ўнутры машыны, такія як падлога ці дзьверы, каб пазьбегнуць мікрахвалёвага адлюстраваньня (вымярэньні паказваюць, што радыяцыя, адлюстраваная ад немэталёвых паверхняў, такіх, як шкло аўтамабіля, значна меншая, чым адлюстраваная ад мэталёвых паверхняў).

Выпадкі пра захворваньні супрацоўнікаў патрульнага ДАІ ракам павінны быць паведамлены у Рэспубліканскі Цэнтар радыяцыйнай мэдыцыны.

Гарэцкі Зьміцер, праграміст. Менск.

Ці робяцца якія небудзь прэпараты, на аснове часныка і ці эфэктыўныя яны?

Паважаны Зьміцер, "Інфарматар" ўжо зьвяртаўся да тэмы Часныка у N8 1996 г. у матэрыяле "Часнык - натуральныя лекі ад усіх хваробаў?". На вашае пытаньне адказваем: сродкі, прыгатаваныя на аснове часныка, як і большасьць прыродных лекаў, не даюць хуткіх вынікаў і могуць быць ня столькі эфэктыўнымі, як хімічныя прэпараты, затое яны практычна бясшкодныя. З гэтага, праўда, не вынікае, што іх можна ўжываць бескантрольна. Любыя лекі неабходна прымаць выключна на паказаньні лекара, альбо інфармацыі, пададзенай ў анатацыі. Гэта, акрамя таго, створыць Вам юрыдычную абарону ў тым выпадку, калі нягледзечы на ўсе перасьцярогі, прэпарат нанясе шкоду здароўю.

Пакуль замежныя прэпараты (у асноўным гэта сродкі агульнападмацоўчага характару, для паляпшэньня працы страўніка і прэпараты для зьніжэньня крывяного ціску) рэдка сустракаюцца ў аптэках Беларусі, часьцей можна сустрэць прэпараты расейскай вытворчасьці **АЛАХОЛ** (жолчагонны, не таксычны, адносна танны) і спіртавая настойка **АЛІЛЧЭП** для стымуляцыі работы страўніка (не такі папулярны і зьяўляецца пад сэзон, таму што робіцца са сьвежых галовак часныка).

Качан Паўліна Леанідаўна, пэнсіянэрка. Менск

Паважаны "Інфарматар" ці можаце Вы расказаць пра тэрміны захоўваньня прадуктаў харчаваньня ў халадзільніку?

Паважаная Паўліна Леанідаўна, мы падаем адмысловую табліцу ў якой падаецца пералік некаторых прадуктаў харчаваньня і тэрмін іх захоўваньня

Што, колькі і як захоўваць у халадзільніку

Прадукты	Тэрмін захоўваньня	Спосаб захоўваньня	Асаблівыя ўказаньні
Масла	6-14 дзён	У закрытым посудзе ці фальзе	Для захоўваньня выкарыстоўваць адзяленьне ў дзьверках
Масла таплёнае	6-10 мес.	У закрытым посудзе	
Маргарын		21-24 дні	У закрытым посудзе
Малако гатаванае	1-2 дні	Пры 4-12С, прыкрытае	Папярэдне абавязкова астудзіць
Малако згушчанае, адкрытае	2-3 дні	Пераліць з бляшанкі	
Сьмятана, вяршкі	2 дні		
Кефір	2 дні		
Сыр	5-12 дзён	У закрытым кантэйнэры пры 3-8С	
Яйкі	14-21 дзень	Вострым канцом уніз	
Мяса сьвежае	2 дні	Пры 2-4С	
Фарш мясны	12 дзён	Пры 2-4С	
Мяса згатаванае	Да 3 дзён	Пры 2-4С	
Кілбаса вэнджаная	4-6 дзён	Пры 6С	
Кілбаса вараная	1-2 дні	Пры 0С	
Рыба вэнджаная	2 дні	У алюміневай фальзе	
Рыба марожаная	14-21 дзён	У маразільніку	
Рыба згатаваная	1 дзень		
Кансэрвы рыбныя	1 дзень	Перакласьці з бляшанкі	
Ежа згатаваная	1 дзень		
Шпік	20 дзён		
Гароднiна сьвежая (у залежнасьці ад віда)	1-7 дзён	У аддзяленьні для гародніны	
Капуста	8 дзён		
Ягады	1-2 дні	Пры 4С	Асобна ад гародніны
Семкавыя	3 дні		
Косткавыя	8 дзён		
Бананы	5-7 дзён	Не ніжэй за 10С	
Сыроп з садавіны	1-2 гады	У стаячым становішчы	
Піва	9-12 дзён	У стаячым становішчы пры 8-12С	
Маянэз	1,5 месяца	У закрытым посудзе пры 5-8С	

Правадзейны член Геаграфічнага таварыства і чытач "НН" Міхась Маліноўскі прапануе усім хто жадае прыняць удзел у вызначэньні: - сямі цудаў сьвету Беларусі; - сямі найвялікшых і найвыдатнейшых збудаваньняў дойлідзтва Беларусі; - сямі найпрыгажэйшых гарадоў Беларусі; - сямі найпрыгажэйшых культавых збудаваньняў; -сямі мястэчак Беларусі; - сямі вёсак Беларусі; - сямі найвыдатнейшых падзей; - сямі славутых гістарычных асобаў Беларусі; - сямі найвыдатнейшых датаў краіны; - сямі найвялікшых пісьменьнікаў (вучоных, мастакоў, юрыстаў, гісторыкаў, падарожнікаў і г.д.)

Калі ў Вас зьявілася цікавасьць зрабіць такія вызначэньні разам зь Міхасём Маліноўскім, дасылайце свае меркаваньні да спадара Маліноўскага на адрэсу:

225320 г. Баранавічы, вул. Брэсцкая, дом 293/2, кв.42
Маліноўскаму Міхасю Міхайлавічу

Вільня

Вяртаньне Гедыміна


22 верасьня ў Вільні на Катэдральнай плошчы быў урачыста адкрыты манумэнт Вялікаму князю Гедыміну. Падзея ператварылася ў народнае сьвята — людзі прыйшлі сюды, каб убачыць адкрыцьцё першага ў гісторыі Вільні літоўскага помніка (несавецкага). Помнік адкрыў прэзыдэнт краіны А.Бразаўскас. Не прысутнічаў толькі аўтар Гедыміна — 81-гадовы Вітаўт Кашуба, які жыве ў Нью Ёрку і якому прыехаць не дазволіла здароўе. Замест яго была ягоная жонка.

Падчас адкрыцьця старшыня фонду Князя Гедыміна Клязайце-Васарыс сказала: «Гэта помнік валадару, які ўладарыў краінаю не мячом і гвалтам, а здаровым розумам». Наконт мяча — гэта недакладна, але тое, што Гедымін увайшоў у гісторыю найперш як таленавіты палітык, заснавальнік уласнай дынастыі і будаўнік Вільні — бясспрэчна.

Ідэя помніка Гедыміну ня новая. Першыя экспэрымэнты з вобразам Вялікага князя сягаюць у мінулае стагодзьдзе. Адным зь першых да вобраза валадара зьвяртаўся беларускі скульптар Мікешын падчас работы над помнікам «Тысячагодзьдзе Русі» для Ноўгарада. Там, паводле ідэалягічнае канцэпцыі, вакол гіганцкага «яблыка» («дзяржавы») стаяць найбольш значныя правадыры народаў, чые землі склалі ядро будучае Расеі. Сярод прапанаваных Мікешынам постацяў кіеўскіх, полацкіх, маскоўскіх і літоўскіх князёў напачатку былі Гедымін, Альгерд і Вітаўт. Аднак з апошніх застаўся толькі Альгерд, як сапраўдны «ревнитель» праваслаўя ў нашым краі.

У самой Вільні конкурс на помнік Гедыміну праводзіўся ў 1933 годзе. У конкурсе бралі ўдзел многія польскія і беларускія скульптары. Пераможцам тады стаў таксама беларус, скульптар Рафал Яўхімовіч, аўтар вядомага бюста Івана Луцкевіча. Мадэль помніка Яўхімовіча да сёньня захоўваецца ў віленскім Мастацкім музэі на ганаровым месцы — на пляцоўцы параднае лесьвіцы. Паводле гэтага праекту, помнік мусіў уяўляць сабою статую вершніка, які цугляе каня перад стромаю каменнае гары. Вобраз князя сымбалізаваў утаймаваньне паганскіх стыхіяў дзікіх Панарскіх гор. У трыццатыя гады ідэя ўтаймаваньня магутных цёмных стыхіяў як найлепей адпавядала грамадзкім настроям. Стылістыка, абраная Яўхімовічам, была экспрэсіянісцкая, пазбаўленая наіўнага рэалістычнага манумэнталізму. На жаль, далей праекту справа не пайшла: спачатку не хапіла сродкаў, пасьля зьмянілася ўсё наогул.

Пазалетась у Вільні быў праведзены новы конкурс на праект помніка Гедыміну. Перавагу аддалі амэрыканскаму скульптару літоўскага паходжаньня Вітаўту Кашубу. Нягледзячы на гарачыя дэбаты вакол такога рашэньня журы, усё ж менавіта амэрыканскі праект быў прыняты да выкананьня ў матэрыяле. Кашуба — ляўрэат Літоўскай нацыянальнай прэміі, аўтар цыклю постацяў усіх Вялікіх князёў, які ён падараваў Нацыянальнай галерэі. Адзін з гэтых твораў, выява Гедыміна, была выстаўлена асобна ў Мастацкім музэі. Дырэктар музэя Будрыс здолеў зрабіць з гэтай выставы значную імпрэзу, а пасьля прапанаваць гэтую работу на конкурс. Рашэньне журы было прадвызначана...



Усё мінулае лета макет помніка ў натуральную велічыню перасоўваўся ў раёне Катэдральнага пляца і сквэра (адкуль папярэдне прыбралі бюст Пушкіна). Мадэль «ужывалася» ў асяродзьдзе, вымяраліся аптымальныя памеры будучага помніка. Сёлета былі праведзеныя маштабныя археалягічныя раскопкі на месцы манумэнта — помнік не павінен быў патрапіць на падмуркі вялікакняскага палаца, які плянуецца аднавіць. І нарэшце месца і памер былі абраныя... Без удзелу амэрыканскага аўтара эстонскія ліцейшчыкі адлілі статуі, украінскія муляры даставілі найлепшы граніт, і помнік быў зmantаваны на працягу двух тыдняў пад кіраўніцтвам літоўскага скульптара Міндаўга Шніпа. Якасьць выкананьня бясспрэчная...

Месца абранае выгоднае: некалі тут стаяла водная калёнка, зробленая як фантан, адлітая з чыгуну, упрыгожаная ліхтарамі. Стагодзьдзе таму яна была кампазыцыйным цэнтрам пляніроўкі гэтага лапіка пляца. Пазьней на гэтым месцы паўстагодзьдзя існавала шыкоўная клюмба, пра якую і цяпер шчыра шкадуюць многія віленчукі. Від на помнік адкрываецца здалёк, на працягу ўсёй вуліцы Замкавай і зь любой кропкі Катэдральнага пляцу. У той жа час ягоны памер быў абраны вельмі тактоўна: манумэнт добра ніжэй ня толькі за будынкі на пляцы, але нават за дрэвы старога парку. Стаючы пад гарою, помнік успрымаецца вельмі камэрна. На блізкі разгляд разьлічаныя і многія ягоныя дэталі...

Помнік складаецца са статуі Гедыміна і княскага каня на гранёным пастамэнце ружовага граніту, зь якога высечаны Жалезны воўк, які флянкуе пастамэнт, нібыта зьявіўшыся з гранітнага туману. Па пастамэнце зьмешчаны таксама выявы выдатных літоўскіх князёў — Гедымінавічаў.

Залішняя рэалістычнасьць дробных дэталяў, вельмі дакладна і суха прамаляваных, шмат асобных элемэнтаў, мала зьвязаных між сабою (князь, конь, воўк, партрэты), — усё гэта заслугоўвае крытыкі. Помнік выглядае хутчэй рэмінісцэнцыяй нацыянал-рамантызму 30-х гадоў. Мой сябра жартуе: «Конік і... конік». Але і сам аўтар, які бачыў помнік толькі на фатаздымках, кажа: «Зь цяжкасьцю пазнаю свой стыль». Праўда, архаічнасьць стылістыкі ў пэўным сэнсе апраўданая, бо помнік «уплецены» ў структуру самай старой часткі места і ня мог быць нэўтральным (бо гэта помнік выключнай асобе) альбо авангардным (бо стварыўся б эстэтычны канфлікт з гістарычным асяродзьдзем). Чыста дыдактычныя функцыі — гэта наіў, аднак падобныя мэмарыялы толькі на тое і прызначаныя: конныя помнікі Шандару Пётэфі, Давіду Гаргасалі, Сухэ-Батару, Жукаву, Хмяльніцкаму і гэтак далей... Наіўнасьць задумы старога скульптара, які паўстагодзьдзя пражыў за акіянам, таксама відавочная: «Я ўявіў сабе, як ён караскаўся на Замкавую гару. Сьцежак там не было. Князю давялося зьлезьці з каня, каб узьняцца наверх. І вось стаіць князь на гары. Працягнуў руку і кажа: «Тут будзе пасад маёй дзяржавы...»

Аднак я магу зразумець літоўцаў, якія, не выкідаючы грошы на рэфэрэндумы, уздымаюць свой нацыянальны дух, даводзяць трываласьць сваіх незалежніцкіх традыцыяў, сьпяшаюцца замацавацца ў Вільні, замаўляючы работы амэрыканцам, украінцам, эстонцам, ствараюць максымальны розгалас. І ведаюць наперад вынік. Гутаркі на пляцы... Электрык: «Будзе чым ганарыцца. Унукаў прывяду — пакажу, легенду распавяду». Бізнэсмэн: «Помнік не руйнуе нічыіх уяўленьняў пра Гедыміна. А наконт таго, што сыйшло шмат грошай... Толькі Езус мог трыма хлябамі накарміць люд». Балерына: «Помнік Гедыміну мне падабаецца. Кветніка не шкада. Нарэшце, гэта — даніна нацыянальнай ідэі». Мэта дасягнутая.

Між іншым, ідэя беларускага помніка Гедыміну таксама не памерла. Дыплёмнай працай скульптара Віктара Голубева (аўтар кампазыцыі «Сьв. Юры-Пераможца» перад Чырвоным касьцёлам у Менску), дзясятак гадоў таму быў... Гедымін. Праект мэмарыялу прызначаўся для Ліды, у якой валадарыў Вялікі князь. Ідэя Голубева была больш арыгінальная: стомлены гаспадар сядзіць у задуменьні на княскім троне, крыху наводдаль дрэмле сабака. Без патэтыкі вобраз стаў шматзначным, хоць і суб'ектыўным.

Бадай, калі-небудзь і ў Ліду вернецца валадар. Толькі я ня ведаю, што скажуць пра яго электрык, бізнэсмэн і балерына...

Сяргей Харэўскі

З гісторыі «Зялёнага Дуба»

Атаман Дзяргач

Гісторыя беларускага антыбальшавіцкага руху пішацца цяжка. Доўгія гады матэрыялы былі схаваная ў архівах КГБ, спэцсховішчах, за грыфам «сакрэтна». Што тычыцца гісторыі антысавецкай палітычнай арганізацыі баявога тыпу «Зялёны Дуб» (яе афіцыйная назва: Беларуская сялянская партыя «Зялёнага Дуба»), то дагэтуль у ёй шмат нявысьветленага. У савецкай гістарыяграфіі за гэтай арганізацыяй замацаваўся безапэляцыйны штамп «тыпова бандыцкай».

Між тым, гісторыя «Зялёнага Дуба» — адна зь яскравых і цікавых старонак беларускага патрыятычнага руху. Як зерне да зерня, у самых розных архівах зьбіраліся факты і сьведчаньні пра тое, як нарадзілася і дзейнічала партыя, каго мела ў саюзьніках, з кім змагалася. Розныя людзі сабраліся ў 20-я гады пад дахам гэтай арганізацыі. Але іх аб'ядноўвалі перакананы антыбальшавізм, жаданьне бачыць Бацькаўшчыну незалежнай і маладосьць.

У 1920 годзе кіраўніку «Зялёнага Дуба» атаману Дзергачу не было і 30-ці. Колькі дакладна, 27 ці 28, — ня ведаю. Справа ў тым, што яго імя часьцей за імёны іншых антысаветчыкаў сустракаецца ў архіўных крыніцах, але вынік з гэтага, на жаль, не багаты. Зьвесткі савецкіх агентаў, што «працавалі» побач з атаманам і нават хадзілі ў сябрах, сьведчаць пра пэўны час яго жыцьця і дзейнасьці, разьмяшчэньне партызанскіх дывэрсійных аддзелаў, рэйды ў савецкую Беларусь і г.д. Данясеньні складаліся таксама з тэмаў гутарак паміж зялёнадубскімі камандзірамі і генэралам Булак-Балаховічам, які пасьля паразы Палескага паходу ўзяў на сябе кантроль за беларускім зялёным партызанскім рухам. Чэкіст, як вынікае з дакладных, сядзеў заўсёды побач за сталом перамоваў.

Архівы дзяржбясьпекі — багатая і цікавая крыніца зялёнадубскай гісторыі. Тым ня менш, дзе і калі нарадзіўся Вячаслаў Адамовіч, атаман Дзяргач, я пакуль не даведалася. Ня ведаю таксама, хто была маці майго героя. Бацька — Вячаслаў Антонавіч Адамовіч, вядомы ў той час палітык палянафільскага накірунку, палкоўнік і пісьменьнік.

Мой калега Віталь Скалабан даведаўся, што Адамовіч-малодшы, атаман Дзяргач, вучыўся ў Бабруйскай гімназіі. А з паказаньняў зялёнадубца Івана Пешкі (партыйная мянушка Густалес), які быў арыштаваны ГПУ у 1939 г., вынікае, што Вячка працягваў навучаньне ў Менскай духоўнай сэмінарыі. І, дарэчы, у пазьнейшы пэрыяд свайго жыцьця (дакладна ў 1939 г.) атаман выкарыстаў гэтаю адукацыю — служыў псаломшчыкам Данцыгскай праваслаўнай царквы.

І.Пешка падчас сьледзтва «ўспамінаў», што ўпершыню пачуў ад Дзергача роднае слова, што менавіта ён арганізаваў у сэмінарыі, дзе панаваў расейскі імпэрскі рух, беларускі гурток, у якім пачалі вывучаць родную мову, літаратуру і гісторыю будучыя сьвятары. «Ён быў шмат за нас старэйшым», —сыцьвярджаў Пешка. Але для сямнаццацігадовага хлопца (Іван Пешка нарадзіўся ў 1900 г.) і 25-ці гадовы — ужо сталы чалавек. Тым больш, што Вячка быў вельмі аўтарытэтны ў вачах сэмінарыстаў грамадзкі дзеяч, знаёмы зь вядомымі тагачаснымі палітыкамі. Праца ў гуртку дала дзівосны вынік. Шмат хто з сэмінарыстаў апынуўся ў шэрагах слуцкіх паўстанцаў, а пасьля паразы Слуцкага збройнага чыну — ў партызанскіх аддзелах «Зялёнага Дуба».

Увогуле мой герой — тыповы прадстаўнік тагачаснага маладога пакаленьня, лепшай, нацыянальна сьвядомай, адукаванай яго часткі. Свабодная незалежная Беларусь была для яго марай і сэнсам жыцьця. Таму і хапала яго на ўсё. Ён быў вядомым у свой час акторам. Выступаў на сцэне Беларускага тэатра. Працаваў разам з Ф.Аляхновічам, нават пісаў п'есы. Польскія ўлады некалькі разоў забаранялі іх пастаноўку, лічачы творы Дзергача антыпольскімі. На жаль, тэкст ніводнай п'есы пакуль не ўдалося знайсьці. Затое калегу Ул.Ляхоўскаму пашчасьціла адшукаць словы песьні «Весяліся, рвісь капыта», аўтар якіх (так пазначана ў нотным сшытку) Адамовіч, а музыку напісаў Ул.Тэраўскі.

На ўспамін прыходзіць урывак зь яшчэ адной крымінальнай справы — «савінкаўскай». У кастрычніку 1921 г. у Менску былі расстраляныя сябры зялёнадубаўскай арганізацыі, якая ў той момант дзейнічала ў хаўрусе з савінкаўскім «Народным саюзам Радзімы і свабоды», таму справа і атрымала такую назву.

Сярод ахвяраў была Ганна Доўгерт, яна ж Ганна Зайцава, Марыя Кавальчук і г.д. За плячыма гэтай дваццацігадовай дзяўчыны была служба ў Нестара Махно, Барыса Савінкава і ў польскай разьведцы. Апошні год яна супрацоўнічала зь «Зялёным Дубам». Падчас сьледзтва назвалася нявестай Дзергача. Ганна была вельмі добра знаёмая зь менскай культурнай элітай. І аднойчы ў кватэры кіраўніка беларускага хору Ул.Тэраўскага, які дапамагаў разьведчыцы, Ганна ўбачыла на сьцяне фотаздымак і расчулілася, пазнаўшы сярод удзельнікаў хору свайго Вячку. І ўжо згаданы Іван Пешка-Густалес таксама сьцьвярджаў, што ў складзе хору Тэраўскага разам зь Дзергачом яны наведалі шмат куткоў Беларусі.

На першым месцы ў рэпэртуары хору была песьня «Зялёны дубочак». Магчыма, адсюль узялася і назва арганізацыі.

Сапраўды «лясны» характар мае і творчасьць Дзергача. Лес надоўга стаў для атамана і родным домам, і месцам змаганьня. Творы Дзергача даволі рэгулярна зьяўляюцца на працягу 1919-20 г. на старонках беларускіх выданьняў: «Звон», «Беларусь», «Рунь». На жаль, невядома, дзе і калі скончыўся жыцьцёвы шлях баявога атамана і пранікнёнага лірыка.

Беларуская грамадзкасьць спачатку пазнаёмілася зь Дзергачом, як з акторам і пісьменьнікам. Пазьней, падчас паходаў на Палесьсе, ён набыў вядомасьць як баявы атаман (палявы камандзір, згодна з сучаснай тэрміналёгіяй). У 1919 годзе пачаўся працэс аб'яднаньня асобных антыбальшавіцкіх партызанскіх аддзяленьняў і складаньне кіраўнічага цэнтру Зялёнага руху. Пра пачатак зялёнай партызанкі і распавядае атаман Адамовіч-Дзяргач у сваіх творах, да якіх мы зьвернемся іншым разам.

Ніна Стужынская

Kalandar

7 kastryčnika

U hety dzień... naradzilisia: kampazytar i palityk Michał Kleafas Ahinski (1765); dacki vučony Niels Bohr (1885-1962),laŭreat Nobeleŭskaj premii ŭ halinie fizyki ŭ 1922 h.; Heinrich Himmler (1900-45), šef Gestapo.

8 kastryčnika

U kanclahery na poŭnačy Rasici pamior Andrej Mryj (1943),biełaruski piśmieńnik.

9 kastryčnika

Naradzilisia: francuski kampazytar Camille Saint-Saens(1835-1921) i John Lennon (1940-80), anhielski muzyka z hurta The Beatles, zabity ŭ New Jorku.

10 kastryčnika

U hety dzień... naradzilisia: francuski mastak Jean Antoine Watteau (1684-1721); italjanski kampazytar Giuseppe Verdi (1813-1901) i biełaruski piśmieńnik Kastuś Tarasaŭ (1940)

11 kastryčnika

U hety dzień... naradziŭsia francuski piśmieńnik FrançoisMauriac (1885-1970), laŭreat litaraturnaj Nobeleŭskaj premii.

12 kastryčnika

Hety dzień 1492 h. ličycca dniom adkryćcia Ameryki i śviatkujecca ŭ USA jak Columbus Day.

Naradziŭsia italjanski tenar Luciano Pavarotti (1935).

13 kastryčnika

U hety dzień naradziłasia baranesa Thatcher of Kesteven u hrafstvie Lincolnshire (1925), pieršaja žančyna-premjer Vialikabrytanii (z 1979 h.) Margaret Thatcher.

Адам Глёбус

Канікулы

фрагмэнты падарожнай аповесьці-эсэ

Ахвярую мастаку Міколу Селешчуку, чыё жыцьцё трагічна абарвалася ў моры падчас вандроўкі па Італіі.

Задавальненьне прыходзіць хвалямі. Няма, — і раптам накаціла, абгарнула, захліснула, накрыла з галавою...

Ты сядзіш і згадваеш караблік — звычайны, белы параходзік, які ў нашу літаратуру выплыў зь лёгкай рукі Міхася Стральцова, а той вычапнуў яго з мапасанаўскай старонкі. Папяровы караблік пусьцілі па хрэстаматыйным моры, каб ён паплыў і выплыў у тваіх згадках у італійскім прыморскім горадзе Рыміні, дзе ніколі ня быў Міхась Стральцоў. Ён ня бачыў тысячы сьветлых караблікаў з мачтамі, зь ветразямі, зь якарамі... А ты сядзіш у кавярні, замовіўшы кубачак кавы на адзін глыток. Ты паліш самакрутку з тытунём «друм». Любуесься караблямі, ветразьнікамі й яхтамі. Чакаеш чарговую хвалю лёгкага задавальненьня, празрыстага зачараваньня й легкакрылага кайфу. Міма цябе праплываюць караблікі. Яны сьлізгаюць пад рэдзенькім, ледзь-ледзь блакітным апэнінскім небам. На носе ў цябе чорныя акуляры, бо (сучасны мастак разбэшчаны тэлевізіяй ды іншымі электроннымі цацкамі) ты не прыхільнік сьляпучага сонца і срэбных колкіх бліцаў на вадзе. Ты —чужаніца, іншы, нетамтэйшы. Ты п'еш моцную, што каньяк, каву й глядзіш на караблі і на раварыстак.

Мужчына на ровары выглядае будзёна. А вось жаноцкае цела вельмі эратычна нaвісае над мігатлівымі коламі. Нават пяцідзесяцігадовая кабета, калі яна коціцца на ровары й лёгенька ўздрыгвае ўсім сваім пэргамэнтнаскурым целам, выклікае ў цябе густое, мляўкае, цягучае пачуцьцё ранішняга самца. Ты хочаш яе так, як жадаюць пакаштаваць духмяную жоўтую антонаўку з пабітым і рудым бокам.

Яшчэ думаецца пра жанчыну, якая зьнікла назаўсёды, а да тваё нагі ўжо падбег і лізнуў лытку сумнавокі сабака басэт. Ты ў шортах. Цёпла, спакойна, ціха. Ты ня ўдарыў сабаку па пысе, бо ў басэта твар пакрыўджанага гішпанскага караля. Пашкадаваў жывёлу. Нават ня плюнуў у губаты твар гаспадыні, якая рэзка тузанула срэбразвонны ланцужок. Не пасьпеў. Яна пачала выбачацца і пырскаць сьлінаю. Прабачэньні на чужой мове кранаюць менш, чым на роднай.

Ты застаўся зь легкадумнымі караблікамі й роварамі, якія каціліся па вузенькай брукаванцы ўздоўж марскога канала. На адным з ровараў круціла понажы стрункая маладзічка. У яе на раме сядзеў хлопчык у блакітнай шапцы. Вецер схапіў шапку і заляпіў вочы раварыстцы. Тая выпусьціла руль, каб скінуць з твару шапку. Пярэдняе кола крутнулася, стала ўпоперак. Задняе — узьляцела ўгару. Жанчына і дзіця апынуліся на бруку. На іх насунуўся масыўны грузавы мэрсэдэс, напакаваны скрынямі з гароднінаю: гуркі, памідоры, буракі, капуста... На брукаванцы ўтварыўся велізарны нацюрморт. Такі нацюрморт не пазычаецца адным мастаком у другога, такія рэчы палохаюць. Зь імі, як са сьмерцю, ты застаесься адзін.

Не-не, ты не расчуліўся, не заплакаў, не ўздыхнуў. Ты застаўся жыць, у адрозьненьне ад маладзічкі і хлопчыка. Іх целы, пабітыя й расьціснутыя, ляжалі пад мэрсэдэсам. Разглядаць нябожчыкаў табе замінаў тоўсты і спакойны, як капіталістычны дабрабыт, гаспадар прыканальнай кавярні і яшчэ трыццаць тры віслівыя італійцы. Яны вырасьлі вакол аварыі проста з-пад бруку.

Давялося сыйсьці ад белабокіх караблікаў у вузкія, гарачыя, пазалочаныя сонцам завулкі...

Цябе цяжка спыніць, але ты спыняесься. Табе падміргвае шакалядны хлопчык-прастытутка. У яго дзявочы твар і па-юначы неакрэсьленая фігура. Але памер нагі, хай сабе й схаваннай у чорным кедзе, адразу вызначае мужчынскую прыроду. У прастытута прывабная ўсьмешка — не цнатлівая й не разбэшчаная. Ён усьміхаецца крышку асуджана, як школьнік, што ня вывучыў верш. Разумееш — ён спэцыяліст па мінэту, майстар ігры на саксафоне. Ён паказвае табе самую дзюбку бэзавага языка. Сьціплае заляцаньне. На запясьці ў прастытута срэбны бранзалет. Узьнікае неадольнае жаданьне ўкалоць яго шавецкай іголкай. Уцякаеш ад жаданьня. Спрабуеш забыць прастытута раз і назаўсёды...

Перабягаеш на другі бок вуліцы й наступаеш на інваліда. Ты набягаеш на яго й націскаеш падэшваю галяндзкага чаравіка на круглую, жоўтую лысую галаву. Інвалід не з крыўдлівых. Ён —стоік, хоць і сядзіць ў калясцы. Залатагаловы інвалід сядзіць у залатой калясцы і маўчыць, і не рэагуе на тваё нахабства. Можаш вярнуцца і яшчэ раз наступіць на галаву. Не абразіцца. Ён намаляваны на асфальце. Намаляванае ня ведае сораму. Як і напісаны герой, ён ня можа зрабіць таго, што не напісана. Ён застаецца на варце месца для жывых інвалідаў, на якіх наступіў лёс...

Стамляесься. Найлепшы час, каб павялічыць хуткасьць перамяшчэньня ў прасторы. Ускокваеш у аўтобус, уладкоўваесься ў крэсьле й імчыш у краіну вечнай свабоды й незалежнасьці, краіну непадступных муроў і абарончых вежаў. Едзеш у Сан-Марына, у маленечкую дзяржаўку, якую не зваявалі ні нацыяналіст Гарыбальдзі, ні інтэрнацыяналіст Напалеон.

Табе робіцца нецікава ў горнай крэпасьці бітма набітай сувэнірным шалупіньнем. Ты ж разумны й ня будзеш купляць ці каштаваць лікёры атрутных колераў. Ня станеш набываць зброю. Ня пойдзеш да менскай прастытуткі, якая пяць гадоў як пакінула Беларусь і праўдамі й няпраўдамі зьвіла гняздо ў апэнінскіх гарах. Яе гняздо — малюпасенькая крамка з паштоўкамі, манэткамі й значкамі. У крамцы ёсьць баковачка з тапчанам. Убачыш яго праз вузкую шчыліну, у той час як мянчанка прапануе хуткае задавальненьне за палову кошту, бо ты беларус, ты белы, ты зь Менску, дзе засталася яе малодшая сястра, якой італійцы не даюць гасьцявую візу. Каб не пакрыўдзіць гаспадыню сувэнірнага шапіка, набываеш праспэкт па Рыму. У прастытуткі ў кутку левага вока сьляза. На санмарынскае сонца трэба выходзіць у акулярах.

Ты кіруесься на рэтраспэктыўную выставу Кірыко. Ты блукаеш сярод белавокіх Апалёнаў і бязногіх Вэнэраў. Яны велічна стаяць пад зялёным, як ісламскі сьцяг, небам фашыстоўскай Італіі. Ты ўздыхаеш на поўныя грудзі густое імпэрскае паветра старажытнага Рыма, якое так любіў заснавальнік нэаклясыцызму Джорджо дэ Кірыко. Залататвары анёл на разьвітаньне падае крыло. У анёла мэталёвыя пёры. Вяртаесься ў аўтобус.

Пасьля падарожжа сьпіцца добра. У пакоі кандыцыянэр. Сон і прахалода — найлепшыя лекі ад стомы. Сьпіш, бачыш сон...

Пагоркі засыпаныя сьнегам. На самы высокі ўздымаюцца манахі ў доўгіх сутанах. Твары хаваюцца ў вастраверхіх капюшонах. Відаць адно няголеныя падбародзьдзі ў сівой шчэці. Манахаў процьма. Жалобнае шэсьце. Працэсія. Першыя шасьцёра нясуць на плячах труну. У ёй нікога няма, толькі дзьве шаўковыя падушачкі — большая і зусім маленькая. Мільгае здагадка: хаваюць жанчыну з хлопчыкам, што загінулі каля марскога каналу...

Ідзеш уздоўж мора па вільготным пяску. Дыхаеш на ўсе грудзі паветрам, якое пахне воблаю. Брыдзеш паміж морам і пяском, на якім смажыцца на сонцы чалавечына. Там мурыны прадаюць драўляных сланоў, а кітайцы — нэфрытавых. Там ад адных выскаленых зубоў да другіх ашчэраных лётаюць мячыкі. Там узвышаюцца мурынкі з жыватамі, большымі за найвялікшы гарбуз, і галовамі, меншымі за грэцкі гарэх. Мурынкі гандлююць хустачкамі. Там ты і ўсьвядоміш простую рэч. Чалавецтва — адно толькі марскі шум. Чалавечыя пакаленьні, як марскія хвалі, безупынна наплываюць і безупынна адплываюць, творачы марныя зьмены. Цьвіль, адным словам. Бруд. Табе адкрываецца ўвачавідкі безнадзейнасьць існага, непатрэбнасьць намаганьняў і нікчэмнасьць памкненьняў. Душу агорне сум. І будзе ён такі ненатольны і несуцешны, як згадка алькаголіка, засаджанага ў турму, пра слодычы апошняй папяросы...



"Мікола Селяшчук" Фотакаляж Алены Адамчык

Вакол Калізэю шныраюць статкі падлеткаў-злодзеяў. Экскурсаводы сварацца на іх і жорстка адштурхоўваюць. Падлеткі-цыганы адыходзяць з пакрыўджаным выглядам. Мы ж нічога кепскага не зрабілі! Бо не пасьпелі!

Цябе не раздражняюць горы сьмецьця, гарачыня, цукерачныя абгорткі, цыгарэтныя фільтры, ванначкі з-пад мусаў і джэмаў, плястыкавыя бутэлькі, пакамечаныя квіткі... Супакоісься, палагаднееш і расслабісься, пакуль не пабачыш, як двухпавярховы аўтобус падае з мосту. Спачатку ён набярэ хуткасьць і ўзьедзе на гару, потым, не зьніжаючы абаротаў, паімчыцца ўніз, да рэчкі, уздоўж яе і паверне на мост. Кіроўца ня ўпішацца ў віраж. Так бывае. Асабліва часта аўтобусы падаюць у кіно, зрэдзьчасу яны падаюць і ў музычных кліпах. У сапраўдным жыцьці такое захочаш — а не пабачыш. Каб аўтобус абрынуўся пасярод вечнага Рыму ў вечны Тыбар. Каб пасажыры загінулі. Каб шафёр, ліха яго бяры, ня справіўся з кіраваньнем. А калі б аўтобус быў аднапавярховы, ён лёгка павярнуў бы і пакаціў да Калізэю...

Ты ў аўтобусе глядзіш тэлевізар і спачуваеш. Хацелася прагнаць маркоту. Колькі можна! Знаходзіш музыку. Сьпявае дзяўчынка, старанная і вельмі шчырая. У мастацтве ня трэба зашмат шчырасьці, але дзяўчынка пра гэта ня ведае. Яна пакрылася потам пад яркімі лямпамі. Ня ведаючы чаму, ты даруеш дзяўчыне памылкі. Своечасова. Камэра пачынае ад'яжджаць, і на зьмену напружанаму прыгожаму твару на экран прыходзяць шэсьць музыкаў у інвалідных калясках. Між іншым, каляскі новенькія й шыкоўныя. У дзяўчыны-сьпявачкі няма левай рукі. Выключаеш тэлевізар. П'еш мінэралку з газам. У Італіі горача.

Адкідаесься ў крэсьле, засынаеш. Сьняцца вэнэцыянскія маскі: белыя, чырвоныя, залатыя. Выдатныя маскі з пустымі вачыма. Ты цалуеш манэкен сьмерці. Цябе накрывае хваля бясконцага задавальненьня. Ты заснуў назаўсёды.

Рыміні — Менск, 1995 г.

Крытыка чыстага

Крадучы і перакручваючы мэтафару Бэрнара Леві, можна сказаць, што твор — гэта, найперш, прыгоды несвабоды. Несвабоды ад мяне, чытача.

Як прыцягнуся пасьля цэлага дня цяжкай працы дадому — чытаю толькі творы, лёгкія як пяро, на якіх бы і знаку не было звышвысілкаў, адшкадаваных аўтарам на напісаньне. Жыцьцё ў мяне малацікавае, а таму мне карціць чытаць такія творы, у якіх можна заблукаць, як у лесе, у лябірынце, у кукурузным полі, на палубе Картасарава «Малькальна», дзе невядома, куды ўвайшоў, каго сустрэнеш і куды выйдзеш. І героя мне хочацца ў творы знайсьці, зь якім мне хацелася б ідэнтыфікавацца, які вёў бы падзеі за рэй. А, па праўдзе кажучы, дык і зрабіце, каб было хораша. Дзень нашага жыцьця гняце мяне, абсалютны антыэстэтызм няроднага, нечароўнага, некаханага, шэранькага гораду дае мне маральнае права патрабаваць ад аўтара, каб было «хораша». Я не хачу чытаць пра тое, што бачу альбо магу ўбачыць; мне падавай тое, чаго я ніколі не пабачу, бо яно бывае толькі ў кніжках і кіно. Я хачу згубіцца ў рамане, аповедзе, нарысе, згубіцца ў пошуках аўтара, абшнырыць кожны закуток лябірынту, абнішкурыць пад кожным карчом у лесе, у кожным калідоры таямнічага параплаву, бадай схапіць за хвост, за каўнер, за вуха. А аўтар няхай уцякае, няхай, пішучы твор, зьмяняецца сам. Я хачу на выйсьці зь лябірынту праводзіць вачыма ІНАКШАГА аўтара.

Глёбус апошніх гадоў нерухомы, хапай хоць за грудкі, хоць за што хоч. Ад пачатку падарожных «раманаў» у нарысах зразумела, што твор НІЧЫМ ня скончыцца, што ніхто ня зьменіцца, ні аўтар, ні пэрсанажы. Аўтар так і будзе сядзець на беларускім завугольлі сярод прывезеных на сувэнір лупінаў ківі, зьедзенага ў «Краснапольскім».


Навошта гэтае эксгібіцыяністкае лупленьне ківі? Бо Беларусь засела на завугольлі Эўропы? Бо Бе-

Зацемкі тутэйшага этнографа

Песьня

Уладзімер Лобач

Бабулі Ксеніі



Якое ні ёсьць, беларускае адраджэньне нязьменна пачыналася зь песьні. Аўтэнтычнай народнай песьні. Бо Новая гісторыя Беларусі — збольшага гісторыя этнічная, а не нацыянальная. Бо сотні гадоў самое зьявішча беларушчыны (мова, фальклёр, мэнтальнасьць) акумулявалася ў сялянскім асяродку і толькі таму і выжыла. Мары пра нацыянальную эліту і беларускі горад у індустрыйную эпоху — цалкам лягічныя й слушныя. Але перад тым, як прыйсьці да такіх ідэяў, чалавек вучыцца сьпяваць беларускія песьні, бо на той момант, калі ён хоча разабрацца «што да чаго», існуе толькі адзінае праўдзівае і жывое —беларускі фальклёр (наўшыркі ўвогуле). У Багушэвіча — «Дудка» і «Смык», Колас, Купала — «песьняры», а потым «Майстроўня», «Паходня», «Талака». Як ні парадаксальна, напрыканцы XX ст. словазлучэньне «беларускі фальклёр» гучыць больш натуральна, чым, скажам, «беларуская дзяржава». Бо беларускі фальклёр паўнавартасна жыў і жывы цяперака, а вось што такое беларуская дзяржава — незразумела й дагэтуль. Сытуацыя для Эўропы непамысная. Эўропа жыве татальнай настальгіяй і рэканструкцыямі, снамі пра часы вікінгаў і боязьзю халестэрыну.

Мы жывем фальклёрам і салам. Песьня — гэта ня простае спалучэньне мэлёдыі і тэксту, як, між іншым, і сала — гэта ня толькі спалучэньне халестырыну й жывёльных тлушчоў, але, сьпярша, адметная смакавая эстэтыка. Калядныя, Веснавыя, Велікодныя, Юраўскія, Сёмушныя, Купальскія, Жнейскія, Талочныя, Восеньскія, Вясельныя, Радзінныя... Гэтае энэргетычнае кола закацілася да нас ці не праз тысячагодзьдзі. Летувіскі прафэсар, паказваючы мне збор «Беларускай Народнай Творчасьці» на сваіх кніжных паліцах, у захапленьні цокаў языком: «О, вы яшчэ не разумееце, якое гэта багацьце!» Натуральна. Бо нашая дзятва, закратаваная, нібы на зоне, у дзіцячых садках, ходзіць па пэрымэтры пляцоўкі і пляскае ў далоні пад баянныя найгрышы абыякавай выхавацелкі: «А у нас всем весело, весело, весело...» А потым яны пачнуць глядзець «Славянскія базары» па «нацыянальным» тэлебачаньні, а потым пойдуць у школу, дзе іх чакае «Крэйсэр Аўрора»...

Нам нібыта сорамна за тое, што бабулькі, якія могуць напяяць паўсотні «даўніх» песень запар, яшчэ жывыя. Нам яшчэ сорамна, што дзе-нідзе носяць ахвяры да сьвятых камянёў і лекуюцца не ў шпіталі, а ў знахара — «Дзікунства!»

Алзін мой знаёмы «нацдэм» неяк запытаўся, чым займацца гісторыка-культурны клюб «Княжыч». Пачуўшы ў адказ, што мы рыхтуем праўдзівае аўтэнтычнае Купальле, ён скрывіўся: «Ну сьпеўкі гэтыя, прыпеўкі, а што сур'ёзнага?» Нам нібыта сорамна, што апроч мітынгаў і шэсьцяў (сур'ёзная справа!) яшчэ ёсьць Купальле й Каляды. Я ўжо не кажу пра «запетраных» у хрысьціянстве. Тут размова кароткая — усё ад д'ябла. Хоць, па шчырасьці, мушу выказаць падзяку праваслаўным папам. Бо, барукаючыся сотні гадоў з усемагчымымі ўнутранымі спакусамі (блуд, п'янства, чэраваўгодніцтва), яны ня мелі сілаў зьвярнуць увагі на паству, якая яшчэ і цяпер выяўляе яскравыя паганскія кшталты, і тым самым захавалі нам фантастычную паводле сваёй унікальнасьці фальклёрную наяўнасьць.

Мне ня дзіўна, што колькасьць «бабулек», якія не забыліся на песьні, і колькасьць гарадзкіх «унукаў», што іх сьвядома развучылі, прыкладна аднолькавая. Фальклёр, калі ён жывы, мае ўласьцівасьць передавацца і захоўвацца толькі паміж СВАІМІ. Маргінал жа, пачуўшы гэтую песьню, зазначыць яе «примитивизм и занудство». Чужак, што жыве побач з табою, не разумее тваіх песень, бо ў тваіх песьнях сіла і прыгажосьць, а ён даўна звыкся да слабасьці й шэрасьці.

Калі яму дрэнна — ён нап'ецца,
Калі дрэнна табе — ты засьпяваеш.

Калі яму добра — ён нап'ецца,
Калі добра табе — ты засьпяваеш.

Вось, збольшага, і ўся розьніца.

Глёбуса

ларусь звыкла нічым не сканчаецца, ня мае сюжэту, а адну толькі фабулу, якая ўсім ужо даўно набіла аскоміну?

Сардэчна-міжвольная безгустоўнасьць Глёбуса, як і наўмысна-празьмерная безгустоўнасьць «Апосталаў нірваны» Гуменюка сьведчаць пра неразуменьне беларускім пісьменствам лёгікі і мэтодыкі дыялёгу з антыэстэтычнасьцю нашага месца ў гісторыі і прасторы. «Дамавікамэрон» быў урбаністычным, фрагмэнтарным і шматслойным, як торт «Напалеон», калі яго скінуць на асфальт зь пятага паверху. Аскепкі фантазіяў і мараў пакаленьня валяліся сярод дваравікоў і гвалтаўнікоў вялікага гораду. Пазбаўленыя сюжэту кавалкі сталіцы, зборышча заганаў і таямніц, заўважных толькі чужынцу, вырваных з кантэксту нашага жыцьця. А ўжо ў «Толькі не гавары маёй маме» — няспынная перамога і ніводнай паразы. Так не бывае нават у кіно.

Было б натуральна, калі б сёньняшнія беларускія літаратары паходзілі ад Маркеса ці Астурыяса. Было б файна, калі б яны паходзілі ад Картасара. Было б прыкольна, калі б ад Нэруды (ня ў сэнсе паштальёна Масіма Траізі). Усім, і Глёбусу таксама, гэтак падабаецца Борхес. І вельмі мала хто пры гэтым імкнецца да мэтафізычнасьці.

Андрэй Дынько

Паўтараем для тых, хто яшчэ не запоўніў.

Размова з чытачамі

АНКЕТА «НН»

220123 Менск, а/с 71, «Наша Ніва», Анкета

Дарагі сябра!

Мінула ўжо дастаткова часу, каб мы маглі абмяняцца думкамі і рабіць наш з Вамі тыднёвік разам. Нішто не замінае нам мець такую «Нашу Ніву», якая б уяўлялася ідэальнай. Пасьля зьмены канцэпцыі выданьня ў 1996 годзе рэдакцыя «НН» увесь час эксьпэрымэнтуе, прапануючы розныя тэмы, жанры, розных аўтараў. Нешта з гэтага замацоўваецца (магчыма, не заўсёды апраўдана), нешта адпадае (таксама, можа быць, дарэмна). Словам, прыйшоў час для ацэнкі нашае працы чытачамі. Мы загадзя ўдзячныя Вам за ўважлівае прачытаньне анкеты і за адказы на яе. Пры гэтым Вы можаце назваць або не называць сябе. Сярод тых лістоў-адказаў, у якіх будуць пазначаныя прозьвішчы і адрасы, мы разгуляем дзесяць прэзэнтаў — 10 асобнікаў зусім новай дакумэнтальнай кнігі выдавецтва «Наша Ніва» — «Менская вясна — 1996». Гэта па-свойму ўнікальнае для Беларусі, багата ілюстраванае выданьне. Адпраўце, калі ласка, Вашы запоўненыя анкеты да 15 кастрычніка. Лічбу насупраць выбранага Вамі адказу абвядзіце колкам.

Вялікі дзякуй.

1. Як даўно Вы чытаеце адноўленую «Нашу Ніву»?

1. З самага першага нумару (травень 1991 г.).
2. З 1991-95 г.
3. З 1996 г.

• •

2. Як Вы ставіцеся да новай (зьмененай у 1996 г.) канцэпцыі «НН»?

1. Стала значна лепш.
2. Стала лепш.
3. Ня бачу істотных зьменаў.
4. Стала горш.
5. Стала значна горш.

Назавіце некалькі пазыцый, паводле якіх, на Вашу думку, выданьне стала лепшым альбо горшым (можна не адказваць):

....

Назавіце, што з «Нашай Нівы» 1991-95 гадоў Вы б вярнулі ў сучасны тыднёвік (можна не адказваць):

....

• •

3. Ці ведаеце Вы гісторыю «Нашай Нівы» пачатку XX ст. (агульныя зьвесткі, імёны пачынальнікаў, аўтараў)?

1. Так.
2. Не.

• •

4. Наколькі, па-Вашаму, сёньняшняя «НН» працягвае справу газэты пачатку XX ст.?

1. Сучасная «НН» працягвае справу легендарнай газэты.
2. Яшчэ рана адказваць на такое пытаньне.
3. Выдаўцы сучаснай «НН» беспадстаўна прысвоілі імя легендарнай газэты.

Якія з пазыцыяў «Нашай Нівы» пачатку XX ст. Вы хацелі б бачыць у сучаснай «НН» (можна не адказваць)?

....

• •

5. Як Вы ацэньваеце ў «Нашай Ніве» (паводле пяцібальнай сыстэмы):

1. аб'ём (колькасьць старонак) ....
2. друк (якасьць) ....
3. ілюстрацыі ....
4. чытэльнасьць і памер шрыфтоў ....
5. першую старонку ....
6. структуру («НН» + Інфарматар) ....

Магчыма, Вам захочацца нешта ўдакладніць?

....

• •

6. Якія сталыя пазыцыі ў «НН» Вы чытаеце і як?

	чытаю (1)	праглядаю (2)	не чытаю (3)	не заўважаю (4)
1. Палітычны камэнтар.	1	2	3	4
2. Рэпартаж.	1	2	3	4
3. Дзёньнікі.	1	2	3	4
4. Апавяданьні (проза).	1	2	3	4
5. Вершы.	1	2	3	4
6. Каляндар.	1	2	3	4
7. Гістарычныя матэрыялы.	1	2	3	4
8. Міжнародны камэнтар.	1	2	3	4
9. Фотаконкурс.	1	2	3	4
10. Інтэрвію.	1	2	3	4
11. Promenade.	1	2	3	4
12. Рэцэнзіі.	1	2	3	4
13. Бэстсэлеры Беларусі.	1	2	3	4
14. Лісты чытачоў.	1	2	3	4
15. Тэксты, набраныя лацінкай	1	2	3	4

Магчыма, Вы захочаце нешта дадаць?

....

• •

7. Зь першага нумару адноўленае «НН» газэта ствාралася як выданьне аўтарскае, якое аддае перавагу суб'ектыўнаму погляду на жыцьцё. Таму для нас важна высьветліць, каго з аўтараў «НН» Вы чытаеце і як?

	чытаю (1)	праглядаю (2)	не чытаю (3)	не заўважаю (4)
1. Славамір Адамовіч *(рэпартажы, вершы).*	1	2	3	4
2. Вадзім Александровіч *(міжнародны камэнтар).*	1	2	3	4
3. Андранік Антанян *(дзёньнік, апавяданьні).*	1	2	3	4
4. Алесь Аркуш *(дзёньнік, апавяданьні).*	1	2	3	4
5. Уладзімер Арлоў *(эсэ).*	1	2	3	4
6. Сяргей Астраўцоў *(дзёньнік, апавяданьні).*	1	2	3	4
7. Натальля Бабіна *(дзёньнік, апавяданьні).*	1	2	3	4
8. Ігар Бабкоў *(камэнтар, проза, вершы).*	1	2	3	4
9. Сяргей Баркоўскі *(камэнтар).*	1	2	3	4
10. Зьміцер Бартосік *(дзёньнік).*	1	2	3	4
11. Адам Глёбус *(«Занатоўкі эгаіста»).*	1	2	3	4
12. Алег Дашкевіч *(інтэрвію, камэнтар).*	1	2	3	4
13. Алег Дзярновіч *(камэнтар, культуралягічныя і гістарычныя артыкулы).*	1	2	3	4
14. Андрэй Дынько *(апавяданьні, міжнародны камэнтар).*	1	2	3	4
15. Валянцін Калнін *(гістарычныя артыкулы, эсэ).*	1	2	3	4
16. Аўген Касьцюшка *(дзёньнік).*	1	2	3	4
17. Паўліна Качаткова *(апавяданьні).*	1	2	3	4
18. Севярын Квяткоўскі *(дзёньнік, Каляндар, інтэрвію).*	1	2	3	4
19. Ігар Кузьняцоў *(гістарычныя артыкулы, дакумэнты).*	1	2	3	4
20. Уладзімер Лобач *(апавяданьні, нататкі).*	1	2	3	4
21. Ганна Матусэвіч *(дзёньнік).*	1	2	3	4
22. Сяргей Пульша *(камэнтар).*	1	2	3	4
23. Марыя Роўда *(апавяданьні).*	1	2	3	4
24. Генадзь Сагановіч *(гістарычныя эсэ).*	1	2	3	4
25. Сяржук Сокалаў-Воюш *(вершы).*	1	2	3	4
26. Тацяна Сьнітко *(дзёньнік).*	1	2	3	4
27. Сяргей Харэўскі *(«Конкурс»).*	1	2	3	4
28. Сяргей Шупа *(дзёньнік).*	1	2	3	4
29. Лявон Юрэвіч *(дзёньнік).*	1	2	3	4

• •

8. Калі ласка, назавіце прозьвішча найлепшага, на Вашу думку, аўтара «НН»:

....

• •

9. Якая тэматыка цікавіць Вас у «НН» найперш?

....

• •

10. Якая публікацыя «НН» зьвярнула на сябе Вашу асаблівую ўвагу (прыгадайце, калі ласка, назву, аўтара або тэму)?

....

• •

11. Якую з публікацыяў гэтага нумару Вы прачыталі з асаблівай цікавасьцю?

....

• •

12. Якой з публікацыяў гэтага нумару, на Вашу думку, магло ў «НН» і ня быць?

....

Працяг на старонцы 16.

Размова з чытачамі

Працяг са старонкі 15.

13. Колькі часу займае ў Вас прачытаньне аднаго нумару «НН»?

....

14. Адкуль Вы даведаліся пра сучасную «Нашу Ніву»?

1. Ад знаёмых, калегаў, сваякоў.
2. З газэтных матэрыялаў пра «НН».
3. Пабачыў у кіёску.
4. Пабачыў у распаўсюднікаў.
5. Іншае.

15. Вызначце, калі ласка, палітычную арыентацыю «Нашай Нівы»?

1. Левацэнтрысцкая.
3. Цэнтрысцкая.
5. Правацэнтрысцкая.
6. Права-кансэрватыўная.
7. Нацыяналістычная.
7. Экстрэмісцкая.
8. Іншая.

16. Ці можаце Вы пагадзіцца, што «НН» у цэлым — газэта аб'ектыўная?

1. Так.
2. Не.
3. Не зусім.

17. Якую з наступных думак Вы падзяляеце?

1. «НН» — гэта элітарны тыднёвік для вузкай групы інтэлектуалаў.
2. «НН» — патэнцыяльна масавае выданьне.
3. У Вас ёсьць іншая думка:

....

18. Найвялікшы, па-Вашаму, недахоп «НН»?

....

19. Свае чытацкія дачыненьні з «НН» Вы акрэсьліваеце як:

1. Сыстэматычныя (імкнуся чытаць кожны чарговы нумар).
2. Хутчэй сыстэматычныя (бывае, прапускаю чарговы нумар).
3. Хутчэй несыстэматычныя (не шукаю чарговы нумар).
4. Чытаю выпадкова.

20. Якім чынам Вы атрымліваеце «Нашу Ніву»?

1. Набываю ў кіёсках.
2. Набываю ў распаўсюднікаў.
3. Атрымліваю праз індывідуальную падпіску.
4. Атрымліваю праз падпіску ўстановы.
5. Даюць пачытаць знаёмыя, сваякі.
6. Чытаю ў бібліятэцы.

21. Колькі чалавек чытаюць Ваш нумар «НН»?

....

22. Якія яшчэ пэрыёдыкі Вы выпісваеце, купляеце, чытаеце?

а.газэты: ....

б. часопісы: ....

23. Якой інфармацыі, на Ваш погляд, бракуе ў «Нашай Ніве»?

....

24. Якія сталыя пазыцыі Інфарматара «НН» Вы чытаеце і як?

чытаю (1) праглядаю (2) не чытаю (3) не заўважаю (4)

1. Кошты на рынках. .... 1 .... 2 .... 3 4
2. Расклады транспарту. .... 1 .... 2 .... 3 4
3. Адукацыя *(пра навучальныя ўстановы)*. .... 1 .... 2 .... 3 4
4. Біржа працы. .... 1 .... 2 .... 3 4
5. Адпачынак *(гульні, забаўкі, шахматы)*. .... 1 .... 2 .... 3 4
6. Псыхалягічныя тэсты. .... 1 .... 2 .... 3 4
7. Спажывец *(пра тавары, прадукты, паслугі)*. .... 1 .... 2 .... 3 4
8. Здароўе *(лекі, мэтодыкі, экалёгія)*. .... 1 .... 2 .... 3 4
9. Гаспадарка *(пабытовыя парады)*. .... 1 .... 2 .... 3 4
10. «Грамафон» *(старонка вершаванага радка)*. .... 1 .... 2 .... 3 4
11. Спорт *(вынікі спаборніцтваў)*. .... 1 .... 2 .... 3 4
12. Бібліятэка. .... 1 .... 2 .... 3 4
13. Замежжа *(пра падарожжы)*. .... 1 .... 2 .... 3 4
14. Адвакат *(правы чалавека)*. .... 1 .... 2 .... 3 4

25. Якія публікацыі Інфарматара «НН» ў ранейшых нумарах «Нашай Нівы» Вам запомніліся?

....

26. Якую з публікацыяў гэтага нумару Інфарматара «НН» Вы прачыталі з асаблівай цікавасьцю?

....

27. Якія тэмы, рубрыкі, на Вашую думку, павінны быць ў Інфарматары «НН»?

....

28. Якіх тэмаў і рубрык у Інфарматары «НН» можа ня быць?

....

29. Якая цана аднаго нумару «НН» уяўляецца Вам аптымальнай?

1. 3.000 БРБ
2. 5.000 БРБ
3. 7.000 БРБ

Магчыма, Вам захочацца штосьці дадаць?

....

Згодна з традыцыяй анкетаваньня, падайце, калі ласка, інфармацыю пра сябе:

32. Пол:

1. Мужчына.
2. Жанчына.

33. Узрост:

1. Да 20 гадоў.
2. 20-29 гадоў.
3. 30-39 гадоў.
4. 40-49 гадоў.
5. 50-59 гадоў.
6. 60 і болей гадоў.

34. Месца жыхарства:

1. Вялікі горад.
3. Горад.
4. Мястэчка.
5. Вёска.

35. Адукацыя:

1. Сярэдняя агульная.
2. Сярэдняя спэцыяльная.
3. Няпоўная вышэйшая.
4. Вышэйшая.

36. Ваш цяперашні занятак:

1. Вучань.
2. Навучэнец ПТВ.
3. Студэнт.
4. Дзяржаўны службовец.
5. Вайсковец.
6. Рабочы.
7. Работнік адукацыі.
8. Работнік культуры.
9. Навуковец.
10. Работнік мэдыцыны.
11. Юрыст.
12. Уладальнік фірмы, прадпрымальнік.
13. Работнік сфэры фінансаў.
14. Работнік гандлю і паслугаў.
15. Работнік фізычнай працы.
16. Сельгасработнік.
17. Пэнсіянэр.
18. Хатняя гаспадыня.
19. Не працую.
20. Іншае:

37. Назавіце, калі ласка, палітычную арганізацыю, якая Вам найбліжэй:

....

38. Назавіце, калі ласка, рэлігійную канфэсію, якая Вам найбліжэй:

....

Вялікі дзякуй за Вашыя адказы.

Конкурс



Якой веры?

Здавалася, што цэнтрабежныя сілы густаў і ідэалёгіяў мусілі б урэшце разарваць нашу нацыю, якая напачатку стагодзьдзя нават паслугоўвалася двума альфабэтамі. Тая, першая «Наша Ніва» гэтак і выходзіла паралельнымі накладамі — лацінкаю для адных, кірыліцаю — для другіх. Здавалася, Усход і Захад, колькі б іх не перамешвалі, ня сыйдуцца ў Беларусі, як вада з алеем.

Але час наканаваў іншае. Насуперак віру чужых стыляў і чужынскіх інтарэсаў, з гэтае мяшанкі паўстала Беларусь, як багіня, што была народжаная з марского шумавіньня. Ужо ў 1916 годзе адзін малады ксёндз Будзька знайшоў аднаго маладога дойліда Вітана-Дубейкаўскага, і папрасіў яго зрабіць касьцёл у стылі... беларускім. І такі праект быў створаны. Праўда, ідэя была рэалізаваная пазьней.

Беларусь уваходзіла ў дваццатае стагодзьдзе з разуменьнем сваёй тоеснасьці, агульнай для ўсіх беларусаў. Працэс бясконцага распаду стыляў і традыцыі скончыўся нараджэньнем новай Беларусі са сваім уяўленьнем пра сябе і са сваёй адрознасьцю ад іншага сьвету, незалежна ад веравызнаньня, ад палітычных прыхільнасьцяў кожнага паасобку. Беларусь знайшла свой шлях да гаспадарства грамадзкае згоды не праз дазаваньне ўдзелу ў ім тых ці іншых суб'ектаў, а праз агульную любоў да Бацькаўшчыны. Толькі яна, Любоў, мусіла закласьці падваліны нашае будучыні... Выйшла ня так.

Але ёсьць помнікі тых часоў, якія прачыняюць нам дзьверы ў той шлях. Леў Вітан-Дубейкаўскі, шчыры каталік паводле выхаваньня і пераканаьняў, не адмаўляў нікому іншае веры, і ствараў бажніцы для розных канфэсіяў.

На здымку — бажніца, якую спраектаваў слынны беларускі дойлід. Да якой кафэсіі належыць гэты храм? Дзе ён знаходзіцца? Гэтымі пытаньнямі мы закрываем наш конкурс. Чакаем адказаў...

Сяргей Харэўскі

Паштовая скрынка

У.М. і **П.С.** зь Менску. На жаль, у адной газэце мусяць суіснаваць матэрыялы для розных чытачоў. У тых матэрыялаў, пра якія Вы пішаце, ёсьць свой чытач, пра што таксама сьведчыць рэдакцыйная пошта.

Ю.К. зь Віцебску. У «НН» ужываюцца толькі два правапісы: «тарашкевіца» і лацінка. Усе іншыя (у т.л. аўтарскія) правапісы ў «НН» не ўжываюцца або выпраўляюцца. Таму Ваш ліст можа быць надрукаваны толькі ў выпраўленым варыянце.

А.К. зь Менску. Ваш почырк «дэшыфраваць» немагчыма.

© НАША НІВА Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая Наклад 5100 Нумар падпісаны ў друк 19⁰⁰, 4/10/1996. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова №6531 Кошт свабодны.